**УДК 378.4(476-25).096:070**
**ББК 76.01р+74.58(4Беп)**

**Рэдкалегія:**
*В. П. Вараб'ёў* (адк. рэд.), *Т. Дз. Арлова*, *Е. Л. Бондарава*, *Т. М. Дасаева*, *Я. І. Дзмітрыеў*, *В. І. Іўчанкаў*, *А. А. Рудэнка*, *І. І. Сачанка*, *А. Г. Слука*, *Б. В. Стральцоў*, *Н. Ц. Фральцова*

**Рэцэнзенты:**
*доктар філалагічных навук, прафесар І. Ф. Ухванава;*
*доктар філалагічных навук, прафесар В. П. Рагойша;*
*доктар сацыялагічных навук, прафесар Д. Г. Ротман*

Рэкамендавана Вучоным саветам факультэта журналістыкі БДУ
(пратакол № 2 ад 1 лістапада 2004 г.)

Рэдакцыйная калегія дзякуе выкладчыкам, выпускнікам, супрацоўнікам архіваў за ўдзел у стварэнні кнігі. Міністэрству інфармацыі Рэспублікі Беларусь дзякуем за выдавецкую падтрымку выдання.

**Журфак** / Аўт.-склад.: В. П. Вараб'ёў, А. К. Свораб, М. П. Карповіч, Т. А. Луйгас; Рэдкал.: В. П. Вараб'ёў (адк. рэд.) і інш. – Мн.: БДУ, 2004. – 306 с.

Кніга «Журфак» прысвечана 60-гадоваму шляху станаўлення і развіцця факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Змест яе складаюць тры раздзелы: «Гэта наша з табой біяграфія», «Родам з журфака», «...І няспынны навуковы пошук». У іх друкуюцца артыкулы дэкана пра родны факультэт, а таксама матэрыялы загадчыкаў кафедраў, выкладчыкаў, праілюстраваныя фотаздымкамі з жыцця факультэта.

Упершыню падаецца ўказальнік імёнаў 5858 выпускнікоў, назаўжды прапісаных на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, а таксама інфармацыя пра абарону кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Абодва паімённыя летапісы складзены паводле архіўных звестак.

Каталог навуковых прац, змешчаны ў кнізе, адлюстроўвае няспынны даследчы пошук выкладчыцкага калектыву.

Адрасуецца выпускнікам, студэнтам, рэдакцыйным супрацоўнікам сродкаў масавай інфармацыі Беларусі і выкладчыкам ВНУ краіны, усім, хто цікавіцца гісторыяй журналісцкай адукацыі.

**УДК 378.4(476-25).096:070**
**ББК 76.01р+74.58(4Беп)**

©Калектыў аўтараў, 2004
© Факультэт журналістыкі, 2004

# Творчы патэнцыял беларускай журналістыкі

**В. П. ВАРАБ'ЁЎ,**
**дэкан факультэта журналістыкі,**
**загадчык кафедры сацыялогіі журналістыкі**
**Белдзяржуніверсітэта**

Факультэту журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта шэсцьдзесят гадоў. Шэсцьдзесят прыступак узыходжання на вышыню навуковай, вучэбнай, метадычнай сталасці. Шэсцьдзесят прыступак да прызнання ў грамадстве, у сваёй дзяржаве.

Творчую вышыню факультэта на сёння ўвасабляюць 56 выпускаў і 5858 студэнтаў-выпускнікоў, моцны Саюз журналістаў Беларусі, значная колькасць членаў Саюза пісьменнікаў. «Залатыя пёры» выхаванцаў журфака шчыруюць у 1500 перыядычных выданнях, на тэлеканалах і радыёстанцыях, у прэс-цэнтрах і прэс-службах, у рэкламных агенцтвах і службах па сувязях з грамадскасцю. Інфармацыйная прастора Беларусі створана на трывалым падмурку нацыянальнага перыядычнага друку і аўдыёвізуальнай камунікацыі. Па вялікім рахунку яна сілкуецца з жыццятворных крыніц беларускай школы журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

60 гадоў – гэта век сталасці і мудрасці. Быў ён нялёгкім. Цярністым. Але ж простых дарог не бывае. І, пэўна ж, чым цяжэйшы шлях, тым больш гонару з таго, што пройдзены ён як мае быць.

...Пасля ліпеньскага вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў ЦК ВКП(б) прымае пастанову ад 9 жніўня 1944 года аб адкрыцці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце факультэта журналістыкі. Гэтай жа дырэктывай прадпісвалася і арганізацыя журфакаў ва універсітэтах Кіева і Масквы. Калегі крыху спазніліся з рэалізацыяй пастановы, а факультэт журналістыкі БДУ быў створаны першым у Савецкім



Саюзе. Кіеўскі журфак свой радавод пачаў у 46-м годзе, а маскоўскі – у 47-м.

Піянерскі пачын журфака БДУ быў не на голым месцы. Першыя спробы спецыялізаванай журналісцкай падрыхтоўкі меліся на базе губернскіх партшкол у Віцебску ў 1918 годзе і ў Мінску ў 1920-м. З 1932 па 41-ы журналісцкія кадры рыхтаваліся ў Мінскім Камуністычным інстытуце журналістыкі (КІЖ) і з 1935 года ў Магілёўскім газетным тэхнікуме. Стварэнне факультэта журналістыкі ва універсітэцкім асяродку знамянавала ўваходжанне журналісцкай адукацыі ў рэчышча сусветнай практыкі.

Заняткі на факультэце журналістыкі БДУ пачаліся 1 лістапада 1944 года адразу на першым і другім курсах, на якіх навучаліся адпаведна 30 і 11 студэнтаў. На факультэт журналістыкі прыйшлі працаваць вядомыя вучоныя і педагогі: М. Р. Ларчанка, У. В. Гутараў, М. І. Жыркевіч, І. В. Зазека. Першым дэканам факультэта журналістыкі быў выкладчык М. У. Ліс, загадчыкам аддзялення – дацэнт

Д. Я. Фактаровіч. 5 красавіка 1946 г. створана кафедра журналістыкі, якую ўзначаліў М. С. Зярніцкі. З 1948 г. на пасаду загадчыка аддзялення быў запрошаны з Масквы былы супрацоўнік газеты «Правда» Г. С. Акулаў. Першы выпуск студэнтаў у 1949 г. у сродкі масавай інфармацыі ўдыхнуў 37 прафесіянальных журналістаў.

З 1955 г. загадчыкам аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта працаваў Р. В. Булацкі, які ў 1967 г. быў прызначаны дэканам аднаўленага факультэта журналістыкі як самастойнага ўжо падраздзялення і загадчыкам кафедры гісторыі журналістыкі. Кафедру радыё і тэлебачання ў 1968 г. заснаваў журналіст і вучоны дацэнт М. Е. Дастанка, потым яе ўзначаліў радыёжурналіст прафесар Я. Р. Радкевіч. У 1969 г. загадчыкам кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі абраны прафесар Б. В. Стральцоў – журналіст, пісьменнік, даследчык тэорыі беларускай публіцыстыкі. Заснавальнікам кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання стаў у 1969 г. знакаміты вучоны і педагог прафесар М. Я. Цікоцкі (з 1965 па 1969 г. загадваў кафедрай тэорыі і практыкі журналістыкі).

Апошняя чвэрць ХХ стагоддзя ўвайшла ў гісторыю факультэта як перыяд пошуку адпавядаючага задачам і здабыткам журфака вучэбнага памяшкання, каб нармалізаваць вучэбна-выхаваўчы працэс, у тым ліку падрыхтоўку журналісцкіх кадраў на замежным аддзяленні. 391 студэнт-замежнік атрымаў дыплом БДУ. Адбылося 20 выпускаў. У многіх краінах з цеплынёй успамінаюць руплівы выкладчыцкі калектыў факультэта, намесніка дэкана А. А. Рудэнку як куратара аддзялення замежных студэнтаў. У 1984 г. была створана кафедра гісторыі замежнай журналістыкі і літаратуры, якую ўзначаліў прафесар І. І. Сачанка.

З 1980 па 1986 г. дэканам факультэта працаваў прафесар П. І. Ткачоў, з 1986 па 1996 г. – прафесар А. Г. Слука, і ў 1996 годзе – дацэнт П. Л. Дарашчонак.

Нават мазаічныя штрыхі гісторыі факультэта журналістыкі красамоўна сведчаць пра яго імклівы рост, станаўленне навуковай і адукацыйнай школ, якія сваімі творчымі набыткамі сілкуюць нацыянальную інфармацыйную прастору.

Сённяшні вектар акадэмічнай палітыкі журфака заключаецца ў далейшым развіцці традыцыйна высокай фундаментальнай універсітэцкай падрыхтоўкі, ва ўмацаванні трывалых творчых сувязяў са сродкамі масавай інфармацыі. Дзеля гэтага кардынальна трансфармаваны вучэбныя планы на аснове новых адукацыйных



*Выпускнікі 2003 года*

дзяржстандартаў Беларусі. Адначасова падрыхтавана і ўведзена ў навучальны працэс новае пакаленне вучэбных праграм (усяго 83) па дысцыплінах вучэбнага плана. Дасканала абноўлены праграмны матэрыял агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін. Усе праграмы прайшлі двухгадовую апрабацыю як на факультэце журналістыкі, так і пры падрыхтоўцы журналістаў у Магілёўскім, Гродзенскім, Віцебскім універсітэтах і Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце.



*Пасяджэнне Вучонага савета факультэта*

Рэфармаванне журналісцкай адукацыі ў краіне на мяжы тысячагоддзяў было выклікана самім жыццём, сацыяльнымі і палітычнымі пераўтварэннямі ў беларускім грамадстве. Трансфармацыю вучэбна-метадычнага працэсу ажыццяўляў літаральна ўвесь калектыў журфака, абноўлены і дасведчаны. Асноўны цяжар гэтай самакрытычнай і мэтанакіраванай працы вынес «штаб» намеснікаў дэкана – А. А. Рудэнка, Я. І. Дзмітрыеў, Т. І. Пpaновіч, А. І. Конанава; новы склад загадчыкаў кафедраў – А. К. Свораб, Л. П. Саянкова, В. Р. Булацкі, Т. М. Дасаева, В. І. Іўчанкаў, В. Р. Вашкевіч, П. Л. Дарашчонак, І. Ф. Ухванава; члены Вучонага Савета, асабліва прафесары-настаўнікі Б. В. Стральцоў, І. І. Сачанка.



*Перапынак на Міжнароднай навуковай канферэнцыі*

Журналісцкія будні і навуковы пошук выявілі патрэбу насычэння класічнага універсітэцкага навучання журналістаў дысцыплінамі сацыяльна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, сацыяльна-псіхалагічнага, прававога, тэхналагічнага профіляў, збалансаваных з філалагічнай і гістарычнай падрыхтоўкай. Бо, па меркаванні вучоных, практыкаў, менавіта




*У дэканаце факультэта*



*Сустрэча з пераможцамі конкурсу «Абітурыент – 2004»*



*Дыплом – выпускніцы 2003 года*

колішняя недасканаласць навучання студэнтаў працэсам збору, апрацоўкі, асэнсавання і інтэрпрэтацыі інфармацыі, эксплуатацыя інтуітыўна-сузіральных метадаў назапашвання фактаў спараджаюць рамесніцкую плынь прэсы, асабліва яе электронных відаў.

Шэраг новых дысцыплін, уведзеных у вучэбны план, арыентаваны на выхаванне ў журналістаў-пачаткоўцаў трывалых навыкаў аб’ектывацыі фактаў жыцця ў палітычным, эканамічным, псіхалагічным кантэксце рэчаіснасці. Комплекс дысцыплін пабудаваны лагічна і дазваляе выпускнікам ажыццяўляць разнастайныя віды прафесійнай дзейнасці:



*У фоталабараторыі факультэта*



Пасяджэнне Дзяржаўнай камісіі па размеркаванню выпускнікоў факультэта журналістыкі

журналісцкай, аўтарскай, арганізатарскай, рэдактарскай, праграмнай і вытворча-тэхналагічнай.

Развенчаны, нарэшце, міф пра дыскусійны характар базавага набору дысцыплін і базавай спецыялізацыі журналістаў. Сёння і выдаўцы, і заснавальнікі, і галоўныя рэдактары, якія прызнаюць грамадскую ролю журналістыкі як творчую духоўна-практычна-стваральную дзейнасць, і тыя з іх, хто разглядае журналісцкую дзейнасць як выключна прапагандысцкую, палітычную ці чыста камерцыйную, дружна фіксуюць дасягнуты «баланс» попыту і прапаноў у выпрацаванай мадэлі журналісцкай адукацыі ў краіне.

Альтэрнатыва рамесніцка-доследнаму шаблону прэсы – у рэчышчы сацыялагізацыі журналістыкі. Выйсце – у рэальным выкарыстанні ў штодзённай практыцы не толькі сігнальных, але колькасных і якасных паказчыкаў рэчаіснасці.

Намаганні выкладчыкаў сёння скіраваны на тое, каб ужо за студэнцкай партай маладыя людзі імкнуліся да журналістыкі з моцным інтэлектуальным, кантэкстуальным падыходам. І студэнты хінуцца да такой журналістыкі, жадаюць стаць летапісцамі рэчаіснасці, а не сучаснасці ў штохвілінным вымярэнні. Іменна такая журналістыка аб'ектыўна запатрабавана грамадствам.

Адначасова факультэту ўдалося ўстанавіць «кансенсус» паміж тэарэтычным навучаннем і практычнай запатрабаванасцю сучаснага беларускага медыяпрацэсу. Сёння падрыхтоўка да журналісцкай дзейнасці вядзецца ў рэальных рэдакцыйных умовах. Літаральна на кожнай спецыяльнай дысцыпліне студэнты авалодваюць не толькі тэарэтычнымі ведамі, але і ўвасабляюць іх у матэрыялы газет і часопісаў, перадачы радыё і тэлебачання. Скразны курс «Журналісцкае майстэрства», заняткі па 20 профілях у творчых майстэрнях інтэгруюць і замацоўваюць практычны аспект універсітэцкага сталення.

Памятаючы, што добрай тэорыі і ведаў многа не бывае ніколі, факультэт скіроўвае навучальны працэс на падрыхтоўку шырока адукаваных спецыялістаў, здольных адаптавацца да самых разнастайных рэдакцыйных умоў. Маюцца на ўвазе розныя тыпы СМІ і журналістыкі і безліч рэдакцыйных спецыялізацый. Таму статус практыкі значна павышаны. У час навучання студэнты праходзяць вучэбна-азнаямляльную практыку, тры вытворчыя і адну пераддыпломную. Цяпер практыка студэнтаў арганічна ўключана ў навучальны працэс. Штогод у верасні студэнцтва шчыруе ў рэдакцыях газет, у калектывах радыё і тэлебачання, рэкламных агенцтваў і прэс-службаў. Ініцыятыўныя, прагныя да штодзённай творчасці юнакі і дзяўчаты маюць магчымасць па



*Пленарнае пасяджэнне Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі*

А пачатак гэтай карпатлівай стваральнай працы ў навукова-абгрунтаваным «селекцыйным» наборы таленавітай і прафесійна арыентаванай моладзі. Спарадычнаму рэпетытарству альтэрнатывай сталі падрыхтоўчыя курсы пры факультэце, створаныя ў 1997 годзе. За сем гадоў праз вячэрнюю абітурыенцкую майстэрню прайшло каля 500 чалавек.

Прафарыентацыю навучэнцаў дапоўнілі творчым конкурсам «Абітурыент журфака» ў маладзёжных выданнях. У 1999 годзе конкурс пачалі ў «Чырвонай змене», у 2001 прадоўжылі ў «Чырвонай змене» і «Переходном возрасте». Далучыліся потым «Знамя юности» і «Репетитор». Праз творчае спаборніцтва апрабавана да 1000 выпускнікоў школ – тых, хто цікавіўся журналістыкай, супрацоўнічаў з газетамі.



*Узнагароды – за лепшыя публікацыі*

ўласным жаданні супрацоўнічаць у ліпені-жніўні з рэдакцыямі газет, радыё, тэлебачання. Творчая справаздача аб практычнай падрыхтоўцы да прафесійнай дзейнасці выносіцца першым пытаннем у білеце на дзяржаўным экзамене.

Выпрабаванне жыццём пацвердзіла слушнасць зробленых захадаў. Падставай служаць справаздачы аб практыцы, водгукі рэдакцыйных калектываў. Творчыя партфелі студэнтаў абнадзейваюць. Хаця перасцярог ад «ломкі планаў» было дастаткова і не ўсе яны адхілены канчаткова.

Выкладчык журфака – гэта практыкуючы трэнер. Усведамляючы гэтую аксіёму, факультэт арганізаваў штогадовую творчую стажыроўку ўсіх выкладчыкаў у СМІ. Само жыццё патрабуе акунацца ў творчае асяроддзе, каб не страціць практычную кваліфікацыю, збалансаваную з тэарэтычным набыткам. Радуе, што старэйшыя калегі сістэматычна ўзнаўляюць вопыт рэдакцыйных будняў. Многія актыўна дзеляцца сваім публіцыстычным роздумам з чытачамі, слухачамі, гледачамі.

Нельга ў гэтай сувязі не ўзгадаць і такое наша агульнае пачынанне, як курсы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў кнігавыдання і сродкаў масавай інфармацыі. Яны не толькі даюць новыя веды слухачам, але стымулююць і выкладчыкаў трымаць належную журналісцкую і педагагічную форму, звяраць свае падыходы з самымі рознымі

прафесійнымі акалічнасцямі ў нашай галіне.

Дарэчы, прайшлі перападрыхтоўку ў нас спецыялісты па дызайну і камп’ютэрнай вёрстцы газет і часопісаў; творчыя работнікі шматтыражных газет, загадчыкі аддзелаў і карэспандэнты рэспубліканскіх газет і часопісаў, якія асвятляюць пытанні эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця; літаратурныя рэдактары кніжных выдавецтваў і работнікі рэдакцыйна-выдавецкага комплексу; супрацоўнікі раённага радыёвяшчання. З лета гэтага года па ўзаемнай ініцыятыве Белтэлерадыёкампаніі і факультэта журналістыкі ўзнаўляецца традыцыя курсаў павышэння кваліфікацыі для супрацоўнікаў кампаніі. Развіццё і ўдасканаленне тэндэнцыі да знітаванасці факультэта з вытворчай сферай масмедыйнай галіны працягваецца.



*Праз некалькі хвілін студэнты-завочнікі стануць дыпламаванымі спецыялістамі*

Адначасова калектыў журфака стаў першапраходцам ва універсітэце па ўкараненні новых актыўных методык выкладання вучэбных дысцыплін і паступовага пераходу на ўзроўневую падрыхтоўку спецыялістаў. Паспяхова ўкаранёна рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў студэнтаў. Мэтавае прызначэнне яе заключаецца ў выпрацоўцы актыўных метадаў і відаў выкладання, якія садзейнічалі б эфектыўнай кантралюемай самастойнай працы студэнта. Лекцыі агляднага, праблемнага тыпу, групавыя кансультацыі пасля вывучэння пэўных раздзелаў, камплекты прамежкавых і выніковых тэстаў сталі звычайнай справай для кожнага выкладчыка.

Журфак мабілізаваны на новыя плённыя здзяйсненні ў акадэмічнай дзейнасці, выкарыстоўваючы сусветныя дасягненні ў тэхналогіях навучання, у мадэрнізацыі адукацыйных праграм, камп’ютэрных і інфармацыйных тэхналогіях. Калектыў журфака, абапіраючыся на вопыт старэйшага пакалення выкладчыкаў, актыўна далучае да педагагічнай дзейнасці журналістаў-практыкаў, моладзь.

Калі ў 1996 годзе на журфаку налічвалася 32 бюджэтныя адзінкі выкладчыкаў і 6 чалавек працавалі з аплатай са спецсродкаў, дык сёння ў нас – 81 адзінка прафесарска-выкладчыцкага складу. Навучальны працэс ажыццяўляюць 122 чалавекі. Рост відавочны. Кваліфікацыйны ўзровень таксама падвоіўся: у 1998 годзе ў нас працавалі 5 дактароў навук і 23 кандыдаты. Сёння ў калектыве працуюць 10 дактароў навук і 49 кандыдатаў навук. Тры прафесары носяць ганаровае званне: М. Я. Цікоцкі – «Заслужа-




*У бібліятэцы факультэта*

ны дзеяч адукацыі», Е. Л. Бондарава – «Заслужаны дзеяч навукі», Б. В. Стральцоў – «Заслужаны дзеяч культуры». Званні «Выдатнік друку Беларусі» маюць 9 чалавек, «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» – 8 выкладчыкаў. Сярод іх нашы старэйшыя высокакваліфікаваныя выкладчыкі: дацэнт С. В. Говін – «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і «Выдатнік друку Беларусі»; дацэнт М. П. Карповіч – «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і «Выдатнік друку Беларусі»; дацэнт А. А. Рудэнка – «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і «Выдатнік друку Беларусі». Дацэнт Ніна Аляксандраўна Сніцарава – Лаўрэат прэміі Саюза журналістаў.

Журфакаўская мара пра сплаў тэорыі і практыкі ў вучэбным працэсе ўвасабляецца: пяць гадоў запар поруч з вядомымі вучонымі, прафесарамі Б. В. Стральцовым, М. Я. Цікоцкім, Е. Л. Бондаравай, І. І. Сачанкам, А. Г. Слукой – «звяздоўцы» У. Б. Наркевіч, Т. У. Падаляк, Л. І. Рыжанкова, «рэспубліканцы» С. В. Дубовік, А. К. Акулік, А. У. Патрэбін, М. А. Валькоўскі, М. І. Дубовік, М. І. Шлома («Мінская праўда»), А. М. Елавік («7 дней»), Г. Б. Пшонік («Переходный возраст»), Н. У. Карпенка («Чырвоная змена»), І. М. Сакалоў («АиФ в Беларуси»), Л. І. Перагудава (часопіс «На экранах»), Б. Л. Залескі, С. В. Сверкуноў («Вечерний Минск»), Г. Б. Багданава (часопіс «Мастацтва»), В. А. Радуцкі (СТБ), В. П. Субат (БДТРК). Тры дзесяткі журналістаў-практыкаў далучыліся да навучальнага працэсу на журфаку.

Дзейсным сродкам умацавання рэдакцыйнага і журфакаўскага супрацоўніцтва стала стварэнне філіялаў кафедраў. Створаны 5 спецыялізаваных філіялаў – творчых лабараторый журналісцкага майстэрства. Гэта філіялы кафедры перыядычнага друку – у рэдакцыі «Рэспублікі», сацыялогіі журналістыкі – у «Звяздзе», радыёвяшчання і тэлебачання – у АТН, замежнай журналістыкі і літаратуры – у «Голасе Радзімы», тэхналогій камунікацыі – у Нацыянальным прэс-цэнтры. Зараз многія студэнты побач з вядомымі майстрамі газетнага і эфірнага слова працуюць у штаце рэдакцый, паступова набываючы прафесійны вопыт.

У выніку крыху сцішыліся папрокі на адрас факультэта, якія не раз гучалі ў рэдакцыйных калідорах з вуснаў не вельмі дыпламатычных калег. Бо вучым і вучымся ўсе разам, талакой. Кожны, хто думае пра будучыню сваёй рэдакцыі, падстаўляе сваё плячо. Гэты рух удзельнікаў падрыхтоўкі журналістаў шырыцца.

Стваральны падыход калектыву журфака да падрыхтоўкі высокапрафесійных спецыялістаў пацвердзілі вынікі шасці атэстацыйных тураў за апошнія два з паловай гады, праведзеных аўтарытэтнымі камісіямі па кантролю за якасцю адукацыі, а таксама яскравыя факты стварэння «з нуля», на аснове менавіта студэнцкіх калектываў, радыё «Мінск», газеты «Минский курьер», тэлекампаніі «ОНТ» і «СТВ» і інш.



*Працуе секцыя «Тэндэнцыі развіцця сучасных СМІ» навукова-практычнай канферэнцыі*

Хаця незадаволенасць і занепакоенасць якасцю падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў –



*У вучэбна-выдавецкай лабараторыі*

з'ява перманентная. Канкурэнцыя за чытача і гледача нарастае. Сітуацыя на медыярынку імкліва змяняецца, як і сутнасныя і статусныя парадыгмы функцыянавання СМІ. Галоўныя рэдактары некаторых выданняў жадаюць атрымаць у свой штат адразу «стопрацэнтна завершаных» журналістаў, забываючыся на свае першыя крокі ў журналістыцы і на абавязковы рэдакцыйны клопат пра «бацькоўскую» даводку спецыяліста. Бязлітасная барацьба за чытача, слухача, гледача, як і за рэдакцыйны ганарар, часта нівеліруе адносіны паміж «класікамі» і пачаткоўцамі, падпарадкоўвае грамадскае, дзяржаўнае асабістаму. Не на карысць справе. Мэтазгодна, відаць, вярнуцца да вядомых ганарарных нажніц, што дазволіла б і студэнту практыкавацца не «пасынкам», і грамадскія асновы СМІ ўзнавіць, і стымуляваць рэдактарскі клопат пра будучае рэдакцыйнае папаўненне.

Трансфармацыя зместу і падыходаў да навучання журналістаў, работнікаў іншых прафесій інфармацыйнай галіны запатрабавала і пэўных структурных зменаў. Факультэт штогод у апошні час адкрывае новыя спецыяльнасці. Таленавітая і творчая моладзь Беларусі сёння мае магчымасць выбіраць па сваім гусце і здольнасцях спецыяльнасці: «журналістыка», «міжнародная журналістыка», «інфармацыя і камунікацыя», «літаратурная работа». Класічная спецыяльнасць «журналістыка» сёння рэалізуецца па двух накірунках: «аўдыёвізуальная журналістыка» і «друкаваныя СМІ».

Мадэрнізацыя навучальнага і навукова-даследчага працэсу на факультэце, абумоўленая новымі перспектывамі развіцця журналістыкі, вымагала павелічэння колькасці кафедраў як цэнтраў навуковай, вучэбнай, метадычнай і выхаваўчай работы: з пяці – да дзевяці. У 1998 годзе створаны кафедры перыядычнага друку, сацыялогіі журналістыкі, літаратурна-мастацкай крытыкі, у 1999 годзе – кафедра тэхналогій камунікацыі, у 2000 годзе – англійскай мовы і моўнай камунікацыі.

Адчуваючы пільную неабходнасць паляпшэння тэхналагічнай і тэхнічнай узброенасці сучаснага журналіста, факультэт стварыў Вучэбны цэнтр камунікацыйных тэхналогій, у склад якога ўваходзяць лабараторыі: фотажурналістыкі, выдавецкая, інфарматыкі і мультымедыя, аўдыёвізуальная.

Абавязкі Цэнтра – не толькі забеспячэнне вучэбнага працэсу, але і тэхнічная падтрымка канферэнцый, выстаў, семінараў і іншых мерапрыемстваў факультэта і універсітэта. Відэа- і фотаматэрыялы, назапашаныя супрацоўнікамі лабараторыі аўдыёвізуальных тэхналогій і лабараторыі фотажурналістыкі, выкарыстоўваюцца ва ўсім універсітэце.

Вучэбна-выдавецкая лабараторыя толькі за апошнія гады падрыхтавала да выдання каля



*Пачынаюцца заняткі на курсах павышэння кваліфікацыі работнікаў СМІ пры факультэце*

60 манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, канспектаў лекцый. Калі раней вучоны, выкладчык заставаўся сам-насам са сваім рукапісам, дык цяпер факультэт узяў ягоны клопат і на свае плечы. Цэнтр паступова становіцца важным суб’ектам факультэцкай дзейнасці са сваімі спецыфічнымі функцыямі.

Навукова-даследчы вектар дзейнасці факультэта журналістыкі скіраваны як на ўдасканаленне навучальнага працэсу, так і на канцэптуальнае асэнсаванне аптымальных шляхоў развіцця нацыянальнай інфармацыйнай прасторы Беларусі. Калектыў адмовіўся ад дробных тэм і пайшоў па шляху міжкафедральных даследаванняў. Вынікі дзейнасці сумеснага творчага калектыву кафедры сацыялогіі журналістыкі і Цэнтра сацыяльна-палітычных даследаванняў БДУ пакладзены ў аснову дырэктыўных дакументаў Міністэрства інфармацыі па развіцці сістэмы СМІ Беларусі. Факультэт увайшоў у якасці асноўнага распрацоўшчыка ў дзяржаўную пяцігадовую праграму «Распрацоўка навуковых асноў ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці». Пададзеная на конкурс дзяржаўных праектаў фундаментальных даследаванняў міжкафедральная праграма «Узаемадзеянне дзяржаўных і недзяржаўных СМІ» заняла першае месца ў БДУ. Тэма «Даследаванне беларускай мовы на мяжы тысячагоддзяў» уключана ў дзяржаўную праграму фундаментальных даследаванняў у сістэме гуманітарных навук на 2001–2005 гады.



*Жаданыя госці факультэта –*
*рэдактары газет, радыё, тэлебачання*



За апошнія пяць гадоў надрукавана 68 вучэбных дапаможнікаў, 22 манаграфіі, 9 навуковых зборнікаў, 1118 навуковых артыкулаў і тэзісаў дакладаў. Толькі ў 2003 годзе выйшлі ў свет 332 навуковыя публікацыі агульным аб’ёмам 385 друкаваных аркушаў.

Дамінуючая роля ў вызначэнні прыярытэтаў навуковага пошуку на факультэце адве-

дзена навукова-даследчай лабараторыі (НДЛ) СМІ пад кіраўніцтвам прафесара Б. В. Стральцова. На стыку стагоддзяў калектыў НДЛ даследаваў тэарэтычныя і прыкладныя праблемы дзейнасці СМІ ў сучасных умовах і прынцыпы фарміравання інфармацыйнай прасторы нацыянальнага тыпу.



*Вось яны, доўгачаканыя кніжкі – дыпломы...*

Дынамізм навуковай сферы факультэта характарызуецца не толькі аб'ёмам і якасцю навуковых прац, але і тэмпам кваліфікацыйнага сталення. За пяць апошніх гадоў абаронена 24 дысертацыі, што складае пятую частку ўсіх кваліфікацыйных прац, абароненых за 60 гадоў існавання факультэта. Гэта дазволіла ўпершыню ў гісторыі журфака ў 2000 г. стварыць «доктарскі» Савет па абароне дысертацый, што ў сваю чаргу прастымулявала паспяховую абарону чатырох доктарскіх дысертацый – вельмі жаданых пасля 15-гадовага тайм-аўта. Аднак абарона кандыдацкіх дысертацый у тэрмін паранейшаму застаецца праблемай. У наступным годзе і ў самай блізкай перспектыве чакаецца абарона доктарскіх дысертацый.

За апошнія 5 гадоў адбыліся 23 навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі выкладчыкаў, студэнтаў, аспірантаў і суіскальнікаў. Закладзена добрая традыцыя – правядзенне Міжнародных навукова-практычных канферэнцый. Сёлета 6-я з іх – Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка – 2004». Такім чынам, створаны ўмовы для штогадовага абагульнення міжнароднага і нацыянальнага вопыту журналісцкай тэорыі і практыкі. Гэта дазваляе аб'ектыўна асэнсоўваць сацыяльна-культурны статус сучаснай журналістыкі і перспектывы яе развіцця.

Міжнародныя навуковыя і педагагічныя сувязі пашыраюцца і па іншых накірунках. За апошнія гады звыш 40 выкладчыкаў удзельнічалі ў міжнародных сімпозіумах і семінарах, праходзілі стажыроўкі ў Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, Швецыі, Іспаніі, Галандыі, Італіі.

Творчая дзейнасць калектыву, спадзяёмся, стане больш плённай, калі зменяцца матэрыяльна-тэхнічныя і пpасторавыя ўмовы журфакаўскага існавання. Песімісты заўжды сумняваліся, ці магчыма з гарантыяй «якасці» выхаваць, выпеставаць і навучыць тысячу студэнтаў у калідорных аўдыторыях пры тэхнічна-тэхналагічным жабрацтве. Калектыў аптымістаў журфака апошнюю чвэрць стагоддзя дружна пярэчыць: чалавечы выкладчыцкі фактар у адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці з яскравым поспехам кампенсуе безліч тэхнічна-тэхналагічных нязручнасцяў. Хаця, зразумела, крэйдай не заменіш ні відэакамеры, ні лічбавыя фотаапараты, ні станцыі камп'ютэрнага мантажу...

Так, самай балючай праблемай ужо якое дзесяцігоддзе застаецца будынак. Дакладней кажучы, яго адсутнасць. Так атрымалася, што журфак ніколі не меў свайго даху, і зараз на кожнага студэнта прыпадае палова квадратнага метра вучэбнай плошчы... Будынак журфака ўзводзіцца на вуліцы Кальварыйскай, 9. Члены



*На сцэне – пераможцы па выніках вытворчай практыкі*



*Самадзейныя артысты факультэта*



Вучонага Савета рабілі ўласнаручна эскізы аўдыторый, творчых майстэрань, тэле-радыёстудый, газетных і здымачных павільёнаў, кафедраў, чытальных залаў... Корпус павінен адпавядаць усім сённяшнім і заўтрашнім патрабаванням журналісцкай адукацыі ў краіне. Праўда, работы ідуць марудна, не такімі хуткімі тэмпамі, як расце попыт на спецыялістаў для СМІ. Журфак вельмі клапоціцца, каб увайсці ў новы будынак памаладзелым, з новай структурай, з новымі ідэямі, каб мець не толькі ўтульныя аўдыторыі, але і адноўленую вучэбна-метадычную і навукова-даследчую базу.

З дасягненнямі, здабыткамі і праблемамі калектыў святкуе сваё 60-годдзе, сцвярджаючы не намі сфармуляваны выраз: журфак – асноўны творчы патэнцыял інфармацыйнай прасторы Беларусі.

Пік яго творчага сталення – наперадзе.

# *Вучым бачыць, думаць, пісаць*

**К**афедра перыядычнага друку была створана ў 1998 годзе на базе кафедры тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі – вядучага падраздзялення факультэта журналістыкі і працягвае яе добрыя традыцыі ў арганізацыі як вучэбна-метадычнай, так і навуковай працы. Галоўным клопатам кафедры па-ранейшаму застаецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў для сродкаў масавай інфармацыі рэспублікі – газет, часопісаў, інфармацыйных агенцтваў. Усё скіравана на тое, каб дапамагчы студэнту паўней засвоіць багаты вопыт вучоных-тэарэтыкаў, майстроў публіцыстычнага слова, развіць яго творчыя здольнасці, каб ён, пакінуўшы сцены факультэта, мог арганічна ўліцца ў рэдакцыйны калектыў. Запатрабаванасць у такіх спецыялістах надзвычай вялікая: сёння на Беларусі выходзіць больш за паўтары тысячы розных па тыпу, аб'ёму і прыналежнасці перыядычных выданняў.

Выкладчыкі кафедры вядуць больш за 15 агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, такіх, як "Асновы журналістыкі", "Журналісцкае майстэрства", "Асновы паліграфіі", "Асновы фотажурналістыкі", "Асновы творчай дзейнасці журналіста", "Дызайн газеты", "Арганізацыя работы рэдакцыі", "Кнігавыдавецтва РБ", распрацаваны новыя – "Камп'ютэрная вёрстка", "Рэгіянальная прэса", "Сеткавая прэса РБ", "Часопісная перыёдыка РБ", "Канструяванне гендэру ў СМІ". Гэтыя і іншыя прадметы выкладаюць вопытныя настаўнікі: дацэнты У. К. Касько, А. А. Градзюшка, Н. А. Кулінка, ст. выкладчыкі У. М. Ладуцька, А. С. Патокская, І. М. Чарткоў. Большасць з іх маюць багаты практычны вопыт у журналістыцы. Да прыкладу, У. К. Касько 15 гадоў рэдагаваў газету "Чырвоная змена", затым працяглы час працаваў дырэктарам выдавецтва "Універсітэцкае". Ён – аўтар манаграфій, шматлікіх





*Творчая майстэрня па фотажурналістыцы*

артыкулаў, эсэ. Такому выкладчыку ёсць што перадаць студэнтам.

У апошні час кафедра папоўнілася новымі маладымі і здольнымі выкладчыкамі – Т. У. Сілінай-Ясінскай, Н. А. Нарынкевіч. Не так даўно яны атрымалі дыпломы выдатнікаў, але ўжо паспелі праявіць сябе найлепшым чынам як у вучэбна-навуковай, так і ў выхаваўчай працы.

Нельга не ўспомніць сёння выкладчыкаў Г. З. Бегуна, А. В. Балаша, В. І. Дубовіка, якія доўгі час самаахвярна працавалі на факультэце і многае зрабілі для распрацоўкі такіх прынцыпова важных дысцыплін, як "Асновы фатаграфіі", "Тэхніка афармлення газеты", "Рэгіянальная прэса РБ".

Да выкладчыцкай дзейнасці ахвотна далучаюцца штатныя супрацоўнікі вядучых рэспубліканскіх газет: намеснікі галоўнага рэдактара "Звязды" У. У. Андрыевіч, М. В. Міхаевіч, М. Л. Рыжанкова, Н. У. Карпенка, адказны сакратар газеты "Рэспубліка" М. І. Дубовік, в. а. галоўнага рэдактара газеты "Знамя юности" В. П. Ерашэнка, галоўныя рэдактары "Вячэрняга Мінска" С. Д. Сверкуноў і "Белорусского тракторостроителя" А. Ф. Пінюта і многія іншыя. Мы вельмі ўдзячныя шматлікім работнікам рэспубліканскіх, абласных і раённых газет, якія, не шкадуючы свайго часу, уважліва і клапатліва вучаць журналісцкай прафесіі нашых студэнтаў падчас практыкі.

Для больш цеснай каардынацыі творчага супрацоўніцтва факультэта са сродкамі масавай інфармацыі створаны некалькі філіялаў кафедраў. Ёсць такі філіял і пры кафедры перыядычнага друку – гэта рэдакцыя газеты "Рэспубліка". Супрацоўнікі філіяла дапамагаюць наладзіць вучэбна-вытворчую і пераддыпломную практыку студэнтаў, праводзяць з імі аўдыторныя заняткі па прафіліруючых дысцыплінах, прымаюць удзел у распрацоўцы пытанняў, звязаных са зместам і методыкай навучальнага працэсу, а таксама ў правядзенні навукова-даследчай працы.



*Заняткі па камп'ютэрнай вёрстцы праводзіць ст. выкладчык І. М. Чарткоў*

Выкладчыкі кафедры пастаянна павышаюць сваю кваліфікацыю ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы, праходзяць стажыроўку ў рэдакцыях газет і часопісаў. За апошнія тры гады большасць з іх прайшлі стажыроўку за мяжой па праграмах TEMPUS і TASSIS – у Германіі, Іспаніі, Швецыі, Аўстрыі і іншых краінах. У той жа час яны самі вядуць заняткі на курсах павышэння кваліфікацыі работнікаў СМІ пры факультэце журналістыкі, а таксама пры Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Навуковыя намаганні супрацоўнікаў кафедры скіраваны на аналіз функцыянавання сродкаў масавай інфармацыі. Выпрацоўваецца сістэма поглядаў на стан беларускай перыёдыкі ў сучаснай інфармацыйнай прасторы, вывучаецца дыяпазон праблематыкі выданняў розных тыпаў, іх графічная канцэпцыя. Асаблівая ўвага ў апошні час сканцэнтравана на даследаванні рэгіянальнай прэсы рэспублікі, яе праблемах і перспектывах развіцця. Асэнсаванне пастаўленных праблем дае магчымасць глыбей зразумець заканамернасці працэсаў, што адбываюцца ў СМІ розных узроўняў.

Члены кафедры актыўна ўдзельнічаюць у навукова-практычных семінарах, як рэспубліканскіх, так і занальных, па праблемах дзейнасці сучаснага друку, якія арганізоўваюцца Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускім саюзам журналістаў.

Як і большасць выкладчыкаў факультэта, члены кафедры перыядычнага друку кіруюць дыпломнымі і курсавымі працамі, тэмы якіх маюць актуальнасць не толькі таму, што адлюстроўваюць змест чытаемых дысцыплін і непасрэдна ўплываюць на прафесійную падрыхтоўку журналістаў-газетчыкаў, але і таму, што адлюстроўваюць накірункі развіцця айчыннай інфармацыйнай прасторы. У апошнія гады ўсё больш студэнтаў-выпускнікоў рыхтуюць дыпломныя работы, у аснове якіх ляжаць іх уласныя публікацыі.

Вялікая ўвага надаецца кафедрай працаўладкаванню выпускнікоў факультэта, замацаванню іх у дзяржаўных сродках масавай інфармацыі. Да размеркавання пяцікурснікаў у СМІ члены кафедры ў цесным кантакце з Міністэрствам інфармацыі РБ вывучаюць запатрабаванасць рэдакцый газет і часопісаў у выпускніках БДУ. Таму на апошнюю, пераддыпломную, практыку студэнты накіроўваюцца ў тыя перыядычныя выданні, дзе найбольш поўна раскрыецца іх творчы патэнцыял. Такія захады спрыяюць адаптацыі выпускніка факультэта ў новым калектыве.

Галоўнай задачай кафедры перыядычнага друку па-ранейшаму застаецца – навучыць студэнта бачыць, думаць, пісаць.

***А. К. СВОРАБ,***
***загадчык кафедры***
***перыядычнага друку***



*Абмяркоўваюцца матэрыялы вытворчай практыкі*

# Несці веды аб культуры як вялікай каштоўнасці



Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі, якая была заснавана ў 1998 годзе, з'яўляецца адной з самый маладых на факультэце журналістыкі. Аднак існаванне літаратурнага, "мастацтвазнаўчага" накірунку было заўважана значна раней. На факультэце журналістыкі, пачынаючы з 50-х гадоў ХХ стагоддзя, адным з прыярытэтных навуковых накірункаў было даследаванне такіх тэм, як пытанні культуры, мастацтва ў сродках масавай інфармацыі, асаблівасці функцыянавання газетна-часопісных спецыялізаваных выданняў па мастацтву, інфармацыйна-аналітычны змест жанраў літаратурна-мастацкай крытыкі, віды мастацтва і віды літаратурна-мастацкай крытыкі. Даследаванне гэтых праблем было часткай комплекснага аналізу сістэмы СМІ, асноў журналісцкай творчай дзейнасці, які праводзіўся на адзінай вялікай кафедры, якая называлася ў той час "кафедра тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі" (пазней – "тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі"). Гэтая кафедра, якую па сённяшні час многія выкладчыкі называюць "нашай агульнай", "роднай" кафедрай, стала "прамаці" адразу трох кафедраў: сацыялогіі журналістыкі, перыядычнага друку і літаратурна-мастацкай крытыкі.

Навуковыя даследаванні заўсёды падмацоўваліся актыўнай практычнай дзейнасцю выкладчыкаў у абранай "спецыялізацыі". Прафесар Е. Л. Бондарава – вядомы ў рэспубліцы кінакрытык, чые аналітычныя рэцэнзіі, інтэрв'ю, агляды, артыкулы па самых розных праблемах кінамастацтва ўпрыгожвалі і ўсесаюзныя, і рэспубліканскія, і гарадскія, і абласныя выданні. Дарэчы, Ефрасіння Леанідаўна Бондарава з'яўляецца адным з заснавальнікаў беларускай школы кінакрытыкі. Прафесар Т. Дз. Арлова – буйны, аўтарытэтны знаўца тэатра. Яе публікацыі па тэатральным мастацтве заўсёды з'яўляюцца ўзорам высокага майстэрства крытыка, знакам журналісцкай якасці. Сёння Таццяна Дзмітрыеўна – адзін з вядучых тэатральных крытыкаў рэспублікі.

Цэнтрам творчага адзінства студэнтаў, якія выўлялі цікавасць да мастацтва, быў гурток “Крытык”, які потым стаў навуковай студэнцкай лабараторыяй. На працягу многіх гадоў на факультэце выпускаліся спецыялізаваныя вучэбныя газеты, на старонках якіх у самых розных жанрах друкаваліся студэнцкія матэрыялы аб мастацтве. З таго даўняга часу быў арганізаваны перыядычны выпуск унікальнага выдання – альманаха студэнцкай літаратурна-мастацкай творчасці “Аўтограф” (выйшла 20 нумароў). Імёны многіх студэнтаў, якія ўпершыню з’явіліся на старонках гэтага выдання, сёння – гонар беларускай культуры: Іван Чыгрынаў, Іван Пташнікаў, Барыс Сачанка, Святлана Алексіевіч, Анатоль Вярцінскі, Ігар Дабралюбаў, Генадзь Бураўкін.

Навуковыя даследаванні, дзейнасць у СМІ выкладчыкаў у якасці крытыкаў, запатрабаванасць студэнтаў, якія спецыялізуюцца па тэмах мастацтва і культуры, у самых розных сродках масавай інфармацыі, – усё гэта прадвызначыла стварэнне спецыяльнай кафедры.

Наша кафедра па колькасным складзе не самая вялікая: усяго чатырнаццаць чалавек. Творчым, прафесійным цэнтрам кафедры з’яўляюцца прафесар, доктар філалагічных навук Е. Л. Бондарава; прафесар, доктар філалагічных навук Т. Дз. Арлова; дацэнт, кандыдат філалагічных навук Н. В. Кузьміч; дацэнт, кандыдат філалагічных навук Г. Ч. Паўлоўская; дацэнт, кандыдат філалагічных навук У. А. Капцаў. Акрамя лекцыйных, семінарскіх заняткаў, навучанне студэнтаў адбываецца ў творчых майстэрнях, якія ўзначальваюць аўтарытэтныя крытыкі ў розных відах мастацтва: дацэнт, кандыдат філалагічных навук, заг. кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта П. В. Васючэнка; дацэнт, галоўны рэдактар часопіса “На экранах” Л. І. Перагудава; кінакрытык, дацэнт, кандыдат філалагічных навук В. А. Мядзведзева; выкладчык, крытык выяўленчага мастацтва Г. Б. Багданава.

Сёння на кафедры вядуцца навуковыя даследаванні па наступных накірунках: асаблівасці функцыянавання літаратурна-мастацкай крытыкі ў сродках масавай інфармацыі, вывучэнне метадалагічных праблем, жанравай сістэмы ў сучаснай крытыцы, аналіз становішча нацыянальнай культуры, асаблівасці функцыянавання масавай культуры ў СМІ, гісторыка-тэарэтычны агляд станаўлення і развіцця розных відаў літаратурна-мастацкай крытыкі. Кафедра рыхтуе студэнтаў па наступных спецыяльнасцях: “журналістыка” (“друкаваныя СМІ”, “аўдыёвізуальныя СМІ”), “міжнародная журналістыка”, “інфармацыя і камунікацыя”, “літаратурная работа”. Асноўныя дысцыпліны, выкладанне якіх забяспечвае кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі:

Літаратурна-мастацкая крытыка;

Культуралогія;

Гісторыя мастацтваў;

Беларуская літаратура;

Руская літаратура;

Асновы тэорыі літаратуры;

Д/с “Асвятленне літаратуры і мастацтва ў СМІ”;

С/с “Актуальныя праблемы публіцыстыкі”;

С/курсы:

“Культура і бізнес”;

“Сучасны беларускі літаратурны авангард”;

“Кінематограф і нацыянальная культура”;

“Мастацтва і псіхааналіз”;

“Сучасны кінапрацэс і спецыялізаваныя выданні”;

“Беларускае выяўленчае мастацтва: гісторыя і сучаснасць”;

“Літаратурна-мастацкая крытыка беларускіх пісьменнікаў”;

“Літаратура рускага замежжа”.

Курсы па профілю:

“Тэатральны крытык”;

“Кінакрытык”;

“Літаратурны крытык”;

“Крытык выяўленчага мастацтва”.

За гады існавання кафедры выкладчыкамі выдадзены навуковыя публікацыі агульным аб'ёмам звыш 500 д. а.

Часта навуковыя даследаванні вядуцца сумесна з калектывамі другіх навучальных устаноў краіны, творчых арганізацый: Нацыянальнай акадэміі навук РБ, Беларускай акадэміі мастацтваў, Беларускага універсітэта культуры, Беларускага саюза кінематаграфістаў, Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. Штогод выкладчыкі кафедры прымаюць удзел у падрыхтоўцы і правядзенні творчых канферэнцый, дыскусій, семінараў па пытаннях кінамастацтва, тэатральнага мастацтва.

Раз у год кафедра праводзіць пасяджэнне секцыі "Літаратурна-мастацкая крытыка" падчас студэнцкай навуковай канферэнцыі. Лепшыя работы студэнтаў штогод адзначаюцца вышэйшымі ўзнагародамі па выніках рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ. Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі была арганізатарам у правядзенні канферэнцый па самых розных пытаннях культуры: "Хрысціянства – 2000", "Браму скарбаў сваіх адчыняю" (да дня нараджэння М. Гарэцкага), "Марк Шагал: ад Віцебска да Парыжа", "Сюррэалізм – гэта я!" (да 100-годдзя з дня нараджэння Сальвадора Далі).

Кафедра пашыраецца, набірае моц. Прыходзяць новыя маладыя выкладчыкі, якія не так даўно былі студэнтамі. Мяняюцца і самі студэнты, жыццё не стаіць на месцы. Трэба думаць, што, нягледзячы на ўсё тое новае, што прыходзіць у наша жыццё, штосьці застанецца нязменным: веды як каштоўнасць, чалавечыя стасункі як раскоша, культура як знак якасці самога жыцця. Хочацца верыць, што такой самай нязменнай каштоўнасцю застанецца і кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі на факультэце журналістыкі.

***Л. П. САЯНКОВА,***
***загадчык кафедры***
***літаратурна-мастацкай крытыкі***



*«Круглы стол», прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Сальвадора Далі*

# *Кафедра, нацэленая на будучыню*

Сёння на кафедры сацыялогіі журналістыкі працуюць 2 дактары філалагічных навук, 7 кандыдатаў філалагічных навук, 1 кандыдат юрыдычных навук, 1 кандыдат сацыялагічных навук, 1 старшы выкладчык, 2 выкладчыкі.

Кафедра забяспечвае вучэбны працэс па 26 спецыяльных і профільных дысцыплінах.

Кафедра сацыялогіі журналістыкі даволі маладая. Яна з'явілася на факультэце пасля рэарганізацыі кафедры тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі ў 1998 годзе. Аб'ектыўнае павышэнне ўзроўню патрабаванняў да якасці журналісцкай дзейнасці выклікала неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове новых навуковых, метадычных і вучэбных распрацовак. Ключавая задача кафедры – умацаванне сувязі паміж тэарэтычнай падрыхтоўкай і развіццём практычных навыкаў студэнтаў – сугучная з асноўным вучэбна-выхаваўчым курсам факультэта журналістыкі.

Сёння на кафедры створаны ўсе неабходныя ўмовы для навуковага росту і творчага сталення выкладчыкаў: рэгулярна выдаюцца падручнікі, вучэбна-метадычныя комплексы і дапаможнікі, канспекты лекцый. Толькі за апошнія тры гады надрукавана звыш за дзесяць вучэбных дапаможнікаў і вучэбна-метадычных комплексаў, у тым ліку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Наладжана сістэма штогадовай стажыроўкі супрацоўнікаў кафедры ў рэспубліканскіх СМІ. У 2000 годзе створаны філіял кафедры ў рэдакцыі рэспубліканскай газеты «Звязда». Гэта дазволіла займацца ўдасканаленнем практычных навыкаў студэнтаў, а таксама павышаць прафесійнае майстэрства выкладчыкаў. Акрамя таго, для работы на кафедру запрошаны галоўныя рэдактары газет і іншыя практыкуючыя журналісты. З'явілася магчымасць абменьвацца вопытам з калегамі з Расіі, Украіны, Германіі, Швецыі, Францыі, Італіі.

Кафедру сацыялогіі журналістыкі арганізаваў і ўзначальвае кандыдат філалагічных навук дацэнт Васіль Пятровіч Вараб'ёў. Ён прыкладае шмат намаганняў, каб вучэбны працэс адпавядаў сучасным навуковым і метадычным патрабаванням, максімальна выкарыстоўваліся новыя адукацыйныя тэхналогіі навучання студэнтаў. Васіль Пятровіч як выкладчык курса "Паліталогія журналістыкі" – першапраходца ў міждысцыплінарнай галіне ведаў, якая дазваляе комплексна аналізаваць узаемадзеянне сродкаў масавай інфармацыі з уладнымі інстытутамі дзяржавы і палітычнымі арганізацыямі. Неабходнасць фарміравання палітычнай культуры ў студэнтаў заснавана на патрэ-



бах практыкі сучасных СМІ. Узрастаючая роля журналістыкі ў сістэме палітычных адносінаў грамадства прадугледжвае асэнсаванне журналістыкі і як спецыфічнага палітычнага інстытута. Станаўленне палітапогіі журналістыкі (медыяпаліталогіі) як новага накірунку навуковага пошуку адбываецца ў рэчышчы вырашэння актуальных інфармацыйна-палітычных праблем і прафесійных задач журналіста.



*Кандыдацкую дысертацыю абараняе А. М. Елавік*

Прафесійны патэнцыял кафедры складаецца з навуковых і творчых дасягненняў яе выкладчыкаў.

Ад першага рэпартажу ў газеце «Советская Армия» ў 1946 годзе да ўласных вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў – творчы шлях доктара філалагічных навук, прафесара Барыса Васільевіча Стральцова. Без перабольшвання ён – заканадаўца ў распрацоўцы пытанняў агульнай тэорыі журналістыкі, бясспрэчны аўтарытэт у галіне прафесійнай этыкі журналіста, выдатны майстар мастацкага слова. Б. В. Стральцоў з'яўляецца старшынёй Савета па абароне дысертацый па журналістыцы, сакратаром Саюза журналістаў. У кожным рэдакцыйным калектыве рэспубліканскіх перыядычных выданняў ёсць вучні і паслядоўнікі прафесара.

Станаўленне беларускай дзяржавы, абарона правоў чалавека прадвызначылі своечасовасць спецкурса «Правы чалавека і беларускія СМІ». Доктар філалагічных навук, прафесар Галіна Казіміраўна Тычко вучыць студэнтаў паважаць правы, законныя інтарэсы грамадзян. Яна таксама выкладае курс “Асновы літаратурна-мастацкай творчасці”.

Дацэнта, кандыдата сацыялагічных навук Яўгена Іванавіча Дзмітрыева лёс прывёў на факультэт у 1997 годзе. Сёння ён намеснік дэкана, чытае курсы лекцый па «Сацыялогіі» і «Сацыялогіі журналістыкі», у якіх адлюстраваныя сучасныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. На першым нацыянальным канале беларускага тэлебачання доўгі час выходзіла ў эфір аўтарская праграма Я. І. Дзмітрыева «Палітычныя дыялогі». Як першага намесніка галоўнага рэдактара яго добра памятаюць чытачы штотыднёвіка «7 дней».

Курс лекцый «Эканоміка і менеджмент камунікацый», курсы па профілю «Брэнд-менеджэр», «Рэкламная камунікацыя» і спецкурс «Мастацтва рэкламы», распрацаваныя дацэнтам Аленай Уладзіміраўнай Маеўскай, дазволілі студэнтам паглыбіцца ў спецыфіку сучаснага майстэрства рэкламнай справы. Практычная работа А. У. Маеўскай – у паспяховым функцыянаванні кампаніі брэндзінгавых камунікацый «Пигмалион», у якім студэнты факультэта журналістыкі ўдасканальваюць бізнес-навыкі. Сярод творчых здабыткаў А. У. Маеўскай – Ганаровы дыплом фіналіста Лонданскага Міжнароднага фестывалю рэкламы (2000 г.), а таксама Ганаровая грамата Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь (2003 г.).

Прававое рэгуляванне дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі студэнты вывучаюць пад кіраўніцтвам дацэнта, кандыдата юрыдычных




*Выкладчык Н. А. Фядотава аналізуе матэрыялы вучэбнай практыкі студэнтаў*

Нядаўна пачалі працоўную дзейнасць на кафедры маладыя выкладчыкі Наталля Аляксандраўна Фядотава і Раіса Іванаўна Меляшэвіч.

Сумяшчальнікі кафедры – знакамітыя журналісты вядучых беларускіх выданняў: дацэнт, кандыдат філалагічных навук Т. У. Падаляк – загадчык аддзела культуры газеты «Звязда», кандыдат гістарычных навук А. К. Акулік – аглядальнік газеты «Рэспубліка», У. Б. Наркевіч – рэдактар газеты «Звязда», М. А. Шлома – рэдактар газеты «Мінская праўда», кандыдат філалагічных навук А. М. Елавік – намеснік рэдактара газеты «7 дней», кандыдат філалагічных навук А. У. Патрэбін – загадчык аддзела газеты «Рэспубліка» і інш. Яны – выпускнікі факультэта журналістыкі, якім добра вядомыя праблемы і перспектывы развіцця нашага факультэта.

навук Н. М. Доўнар. Жывая цікавасць будучых журналістаў да лекцый Наталлі Мікалаеўны тлумачыцца яе практычнай дзейнасцю ў якасці намесніка старшыні Мінскай абласной калегіі адвакатаў. Набыццё студэнтамі вопыту ў вырашэнні канфліктных сітуацый паслужыць юрыдычным плацдармам у пытаннях прафесійнай дзейнасці журналіста.

Шматграннасць праблематыкі сродкаў масавай інфармацыі выклікала да жыцця спецкурсы «Праблематыка СМІ» і «Пытанні аграэканомікі», якія выкладае кандыдат філалагічных навук, дацэнт Людміла Пятроўна Белякова.

Тэарэтычная і практычная дзейнасць таленавітых людзей, якія працуюць на кафедры, – важны ўклад у агульную справу далейшага ўмацавання беларускай школы журналістыкі.

***Т. А. ЛУЙГАС,***
***старшы выкладчык***
***кафедры сацыялогіі журналістыкі***



*Добрага шляху выпускнікам факультэта жадае прафесар Б. В. Стральцоў*

# Зоркі эфіру запальвае кафедра



Кафедра тэлебачання і радыёвяшчання з'яўляецца выпускаючай кафедрай факультэта журналістыкі. Яна ажыццяўляе падрыхтоўку студэнтаў па спецыяльнасці «Журналістыка», напрамак «Журналістыка (аўдыёвізуальная)». Штогод кафедра выпускае 15–20 студэнтаў, якія навучаюцца на бюджэтнай форме, і прыкладна такую ж колькасць студэнтаў платнай формы навучання.

Кафедра вядзе работу па далучэнні да вучэбнага працэсу навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Так, за апошнія гады ў штат кафедры залічаны: кандыдат філасофскіх навук Д. Л. Яканюк, кандыдат палітычных навук А. А. Бялько, кандыдат гістарычных навук А. М. Пустаход, кандыдат філалагічных навук, дацэнт В. А. Мядзведзева, кандыдат мастацтвазнаўства А. І. Чупрынскі. Шэраг дысцыплін на кафедры выкладаюць вядучыя журналісты беларускага радыё і тэлебачання: вядомая тэлежурналістка Л. І. Мельнікава з тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі "Саюз" Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, В. А. Радуцкі, С. Г. Кацьер, П. С. Каранеўскі, Я. В. Хрусталёў, А. Б. Васюкевіч і іншыя.

Кафедра ўкараняе ў вучэбны працэс новыя віды кантролю і ацэнкі ведаў студэнтаў. Распрацаваны тэставыя заданні для прамежкавага і выніковага кантролю, уведзена рэйтынгавая сістэма, якая дазваляе ажыццяўляць пастаянны кантроль за працэсам засваення зместу матэрыяла, а не толькі за яго вынікамі на экзаменах. Абнаўляюцца тэхналогіі навучання, накіраваныя на павышэнне пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці студэнтаў.

На кафедры шмат увагі надаецца вучэбна-метадычнай працы. Аўтарскім калектывам падрыхтаваны да друку рукапіс вучэбнага дапаможніка «Асновы радыёжурналістыкі». Выдадзены курс лекцый «Информационные и аналитические жанры радиожурналистики», распрацаваны вучэбна-метадычныя комплексы па наступных дысцыплінах: «Сучасныя публіцыстычныя жанры і формы электроннай журналістыкі» (дац. Д. Л. Яканюк), «Асноўныя этапы развіцця аўдыёвізуальных СМІ» (дац. А. А. Плаўнік). Распрацаваны новыя вучэбныя праграмы па наступных дысцыплінах: «Асновы тэлерадыёжурналістыкі» (дац. В. Р. Булацкі), «Тэлепубліцыстыка» (дац. А. А. Бялько), д/с «Мастацкае вяшчанне на РТБ» (дац. Д. Л. Яканюк), «Інфармацыйна-аналітычныя жанры радыёжурналістыкі» (дац. В. М. Шэін), «Сучасныя публіцыстыч-

ныя жанры і формы электроннай журналістыкі» (дац. Д. Л. Яканюк). Абноўлены вучэбныя праграмы: «Тэхніка РТБ», «Асновы тэлерадыёжурналістыкі», «Методыка тэлежурналістыкі», «Мастацка-публіцыстычныя жанры РТБ», «Грамадска-палітычная праблематыка РТБ», «Актуальныя праблемы развіцця сусветнага РТБ», «Рэгіянальнае РТБ», «Асновы тэлерадыёжурналістыкі».

З мэтай найбольш эфектыўнай арганізацыі вытворчай практыкі студэнтаў факультэт заключыў дагаворы аб супрацоўніцтве з Белтэлерадыёкампаніяй, тэлекампаніямі ЗАТ «СТБ», ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» (ОНТ), Прадстаўніцтвам МДТРК «Мир» у РБ, а таксама з арганізацыямі заводскага радыё ВА «МТЗ», «МАЗ», «Інтэграл», «Атлант».

Практыка пачынаецца на другім курсе і называецца *азнаямляльнай*. Студэнты на першую сваю практыку накіроўваюцца на так званыя «нізавыя» радыёстанцыі – заводскае радыё і мясцовыя гарадскія радыёстанцыі, раённае радыёвяшчанне ў абласцях. На трэцім курсе студэнты ідуць на *вытворчую* практыку ўжо адпаведна сваім творчым пажаданням. На чацвёртым курсе практыка пачынаецца ў жніўні і доўжыцца восем тыдняў. На пятым курсе дзве практыкі: *вытворчая* на працягу васьмі тыдняў у верасні і кастрычніку і *перaддыпломная* ў лютым.

Кожны студэнт па выніках сваёй практыкі піша падрабязную справаздачу і прадстаўляе афіцыйную характарыстыку і матэрыялы, якія былі ў эфіры або пастаўлены ў задзел. Вытворчая практыка, па сутнасці, з'яўляецца падставай для канкрэтнага будучага прафесійнага ўладкавання студэнта. Часта па выніках практыкі на студэнта дасылаецца заява для дзяржаўнага размеркавання.

Навуковая работа ажыццяўляецца па актуальных накірунках функцыянавання аўдыёвізуальных СМІ ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах і скіравана на асэнсоўванне новых рэалій іх развіцця. Так, у 1999–2002 гг. кафедрай упершыню было праведзена комплекснае вывучэнне дзейнасці аўдыёвізуальных СМІ Беларусі ў 90-я гады ХХ ст. У выніку праведзенага даследавання была абгрунтавана неабходнасць стварэння прынцыпова новага інстытута сродкаў аўдыёвізуальнай камунікацыі, які б улічваў дзяржаўна-палітычныя інтарэсы, інтарэсы аўдыторыі, фарміраваў адэкватную сацыяльную мадэль грамадства; былі прапанаваныя канкрэтныя варыянты структурна-творчых пераўтварэнняў; выпрацаваныя рэкамендацыі па мадэрнізацыі вяшчання беларускага тэлебачання і радыё, якія былі выкарастаныя ў працэсе рэарганізацыі нацыянальнага тэлебачання і радыё.

Галоўным у НДР у 2004–2005 гг. з'яўляецца даследаванне трансфармацыі функцыянальна-структурных асаблівасцей і прафесійнага майстэрства ў сучасных аўдыёвізуальных СМІ Беларусі. У 2002 годзе праца ішла па лініі распрацоўкі канцэпцыі ў галіне рэгулявання сацыяльна-культурных суб'ектаў камунікацыйнай дзейнасці розных форм уласнасці. У 2003 годзе праводзілася даследаванне асаблівасцей творчага працэсу ў рэспубліканскіх, рэгіянальных і мясцовых аўдыёвізуальных СМІ Беларусі, а ў 2004 годзе – даследаванне ўздзеяння трансфармацыі функцыянальна-структурных асаблівасцей тэлерадыёвяшчання Беларусі на творчы працэс. У маі 2005 года запланавана правядзенне «круглага стала» ў сувязі з 80-годдзем беларускага радыёвяшчання. Кожны год члены кафедры прымаюць удзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі па праблемах гісторыі, сучаснага стану аўдыёвізуальнай журналістыкі Беларусі і іншых краін. Супрацоўнікі кафедры прымалі актыўны ўдзел у выкананні міжкафедральнай дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Узаемадзеянне дзяржаўных і недзяржаўных СМК Беларусі ў кантэксце сучаснай грамадска-палітычнай і сацыякультурнай сітуацыі».

Навукова-даследчая работа студэнтаў непасрэдна звязана з навуковай тэмай кафедры тэлебачання і радыёвяшчання. Праблематыка навуковых студэнцкіх даследаванняў – ад гісторыі да сучаснага стану тэлебачання і радыёвя-

шчання. Асаблівая ўвага надаецца актуальным пытанням функцыянавання нацыянальнага тэлерадыёвяшчання, асаблівасцям работы беларускіх тэлерадыёжурналістаў. На традыцыйнай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і аспіранатаў у рамках секцыі «Тэлебачанне і радыёвяшчанне» штогод прадстаўлена звыш 20 дакладаў.



*У лабараторыі аўдыёвізуальных тэхналогій*

Выхаваўчая работа са студэнтамі вядзецца выкладчыкамі кафедры як падчас навучальнага працэсу, так і ў пазааўдыторныя гадзіны. Патрыятычнае, ідэалагічнае, эстэтычнае выхаванне спалучаецца з вучэбным працэсам. Кафедра прымае актыўны ўдзел у агульнауніверсітэцкім жыцці.



*У вучэбнай радыёстудыі*

Кафедра падтрымлівае цесныя сувязі з дзяржаўнымі органамі і тэлерадыёарганізацыямі. Па даручэнні Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь калектыў кафедры сумесна з Інстытутам сацыяльна-палітычных даследаванняў на працягу 2003–2004 гг. праводзіў аналіз працы беларускіх тэлевізійных каналаў. Згодна з планам, распрацаваным Міністэрствам інфармацыі РБ, кафедра на базе Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі арганізуе і праводзіць курсы павышэння кваліфікацыі. Дацэнты А. А. Бялько і В. М. Шэін у 2003 г. праводзілі курсы павышэння кваліфікацыі ў абласным тэлерадыёаб’яднанні (г. Брэст). Супрацоўнікі кафедры рэгулярна прымаюць удзел у тэлерадыёперадачах.

Эфектыўнай формай прафесійнай вучобы і выхаваўчай працы зарэкамендавалі сябе рэгулярныя сустрэчы студэнтаў з кіраўнікамі і вядучымі супрацоўнікамі дзяржаўных тэлерадыёарганізацый.

***В. Р. БУЛАЦКІ,***
***загадчык кафедры***
***тэлебачання і радыёвяшчання***

# Міжнародная журналістыка ў нацыянальным увасабленні

**60**-гадовы юбілей факультэта журналістыкі супадае з 20-годдзем кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры, створанай у верасні 1984 г. Ініцыятарам і заснавальнікам кафедры з'яўляецца доктар гістарычных навук, прафесар І. І. Сачанка. У яго творчым набытку каля двухсот навуковых прац па праблемах гісторыі, тэорыі і практыкі замежнай журналістыкі, у тым ліку сем манаграфій, восем вучэбных дапаможнікаў, чатырнаццаць брашур. І. І. Сачанка дзевятнаццаць гадоў узначальваў кафедру. Шмат намаганняў і часцінку сваёй душы аддаў ён дзеля таго, каб створаная ім кафедра заняла пачэснае месца на факультэце. Дзякуючы прыцягненню і выкарыстанню вопыту айчыннай і замежнай журналістыкі, калектыў кафедры забяспечыў трывалую метадалагічную базу для прафесійнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі.

Па сваім характары кафедра з'яўляецца шматпрофільнай. У агульнай сістэме вучэбнага працэсу факультэта журналістыкі яна забяспечвае выкладанне дзвюх асноўных дысцыплін: замежнай журналістыкі і замежнай літаратуры для ўсіх спецыяльнасцей.

З 1998/99 навучальнага года кафедра з'яўляецца выпускаючай па спецыяльнасці "міжнародная журналістыка" (кваліфікацыя "журналіст-міжнароднік") і ажыццяўляе прафесійную падрыхтоўку па дзвюх спецыялізацыях: "міжнародная журналістыка і палітыка", "міжнародная журналістыка і эканоміка". Гэты фактар прадвызначыў новы этап у развіцці кафедры. Праграма падрыхтоўкі спецыялістаў новай кваліфікацыі ўключае перш за ўсё наступныя асноўныя накірункі: гісторыю развіцця і функцыі СМІ ў розных краінах; сучаснае станаўленне і перспектывы сусветнай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы; тыпалогію, мадэлі замежных СМІ; тэорыю, метады і прыёмы сучаснай замежнай журналістыкі; журналістыку ў розных рэгіёнах свету ва ўмовах інфармацыйнай глабалізацыі і фарміравання інфармацыйнага грамадства; сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі ў практыцы замежных СМІ; значэнне вопыту замежнай журналістыкі для развіцця СМІ Рэспублікі Беларусь; вопыт навуковых даследаванняў у галіне замежнай журналістыкі; сучасныя замежныя тэорыі журналістыкі.

Увогуле за кафедрай замацавана 24 агульнапрафесійныя і спецыяльныя дысцыпліны. Праграма падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці "міжнародная журналістыка" прадугледжвае магчымасць выбару самім студэнтам спецдысцыплін ("Журналістыка навін", "Журналістыка меркаванняў і расследаванняў", "Тэхналогіі эканамічнай журналістыкі", "Тэхналогія палітычнага аналізу ў журналісц-



кай дзейнасці”) і спецкурсаў (“Тэорыя і методыка тэлежурналістыкі”, “Тэорыя і методыка радыёжурналістыкі” і інш.). Немалаважнымі з’яўляюцца і такія курсы, як “Дзяржаўны пратакол і этыкет”, “Беларусь у сістэме міжнародных гаспадарчых сувязей”, “Вывучэнне сучасных PR-тэхналогій”, “Праблематыка і спецыфіка Інтэрнет”, “Прававыя аспекты дзейнасці замежных СМІ”.

На працягу вучобы студэнты маюць магчымасць набыць не толькі тэарэтычныя, але і практычныя веды і знайсці ім непасрэднае прымяненне. З мэтай творчага супрацоўніцтва са сродкамі масавай інфармацыі дэканат факультэта журналістыкі накіроўвае студэнтаў для праходжання практыкі ў міжнародныя аддзелы радыё, тэлебачання і газет. Адна з іх – “Голас Радзімы”, на базе якой ў 2001 годзе створаны філіял кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры. Калектыў газеты пад кіраўніцтвам галоўнага рэдактара Н. У. Салук стварае спрыяльныя ўмовы для практыкантаў, дапамагае ім у авалоданні журналісцкім майстэрствам. У газеце ёсць Аддзел міжнародных кантактаў і сістэматызацыі інфармацыі, у якім назапашаны звесткі пра сувязі Беларусі з рознымі краінамі свету. Студэнты маюць доступ да інфармацыі, якую могуць выкарыстоўваць пры напісанні курсавых ці дыпломных праектаў, артыкулаў.

Факультэт журналістыкі актыўна наладжвае і развівае сувязі з замежнымі калегамі, вядучымі еўрапейскімі цэнтрамі падрыхтоўкі журналістаў, журналісцкімі арганізацыямі; супрацоўнічае з імі ў межах агульнаадукацыйных праграм. Для інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу, пастаяннага павышэння яго эфектыўнасці, укаранення найноўшай замежнай методыкі правядзення лекцыйных, практычных і семінарскіх заняткаў выкладчыкі кафедры павышаюць свой прафесійны ўзровень падчас стажыровак у замежных краінах: Германіі, Швецыі, Францыі, Вялікабрытаніі, Іспаніі і інш. Набыты вопыт актыўна выкарыстоўваецца як у працы са студэнтамі, так і ў навукова-даследчай дзейнасці.

Узбагаціць свае прафесійныя навыкі ў замежных краінах мае магчымасць і пэўная колькасць студэнтаў спецыяльнасці “міжнародная журналістыка”. Па ініцыятыве выкладчыкаў кафедры міжнароднай журналістыкі і літаратуры пад кіраўніцтвам дацэнта А. І. Конанавай па дамоўленасці з журналістамі Германіі, Швецыі на факультэце арганізавана праслухоўванне лекцый і правядзенне практычных заняткаў для студэнтаў спецыяльнасці “міжнародная журналістыка”.

На кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры працуе невялікі зладжаны калектыў. У складзе яго два прафесары, дактары навук І. І. Сачанка і Т. М. Дасаева, якая з верасня 2003 года ўзначальвае кафедру; два дацэнты, кандыдаты навук А. І. Конанава, Я. Ф. Конеў; два старшыя выкладчыкі – Т. І. Прановіч і кандыдат навук Т. С. Студзенка, а таксама два выкладчыкі – штатныя супрацоўнікі рэспубліканскіх перыядычных выданняў: галоўны рэдактар газеты “Міжнародны клуб” Б. Л. Залескі і намеснік галоўнага рэдактара газеты “Рэспубліка” М. П. Валькоўскі. Выкладчыкі кафедры ўдала спалучаюць прафесійную педагагічную дзейнасць з грамадскай і творчай. Так, І. І. Сачанка – Лаурэат прэміі Саюза журналістаў СССР (1982 г.), Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (1998 г.), Заслужаны журналіст Рэспублікі Беларусь (1999 г.) – шмат гадоў узначальвае “Мінскае гарадское аб’яднанне былых малалетніх вязняў фашызму”.

Па ініцыятыве члена Саюза беларускіх пісьменнікаў Т. М. Дасаевай у 1999 годзе на факультэце было створана студэнцкае літаратурна-творчае аб’яднанне “Вуліца летуценнікаў”. Пад кіраўніцтвам Т. М. Дасаевай сябры гэтага аб’яднання праводзяць на факультэце вечары паэзіі, ажыццяўляюць тэатральныя пастаноўкі, арганізоўваюць сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі.

Выдатнік друку Беларусі (2004 г.), намеснік дэкана факультэта журналістыкі па навуковай працы і міжнародных сувязях А. І. Конанава займаецца арганізацыяй навуковых канферэнцый, наладжваннем кантактаў з замежнымі краінамі.

Т. І. Пpановіч сумяшчае выкладчыцкую працу з практычнай журналісцкай дзейнасцю. Яна з’яўляецца намеснікам галоўнага рэдактара газеты “Переходный возраст”, што дазваляе ёй паспяхова выконваць абавязкі намесніка дэкана па творчым супрацоўніцтве са сродкамі масавай інфармацыі. Т. І. Пpановіч узначальвае працу па правядзенні алімпіяд “Абітурыент журфака”, якія дазваляюць выявіць таленавітых юнакоў і дзяўчат сярод тых, хто збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі.

Я. Ф. Конеў – член Саюза беларускіх пісьменнікаў. Ён плённа працуе ў розных жанрах на ніве літаратурнай творчасці. Перавагу аддае гістарычнай тэматыцы.

Усе выкладчыкі кафедры прымаюць удзел у арганізацыі навукова-даследчай і навукова-метадычнай працы. На сучасным этапе калектыў кафедры выконвае планавую тэму “Эвалюцыя міжнароднай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы ў працэсе інтэграцыі краін Еўрапейскага кантыненту” (2001–2004 гг.). Навукова-тэарэтычнае асэнсаванне ўзнятай праблемы дало магчымасць выявіць заканамернасці і асаблівасці працэсаў глабалізацыі прэсы Еўропы, зрабіць важныя тэарэтычныя і практычныя высновы аб транснацыяналізацыі сродкаў масавай інфармацыі Еўрапейскага кантынента, вызначыць узаемасувязь інтэрнацыяналізацыі базісных і надбудоўных інстытутаў дзяржаў, метадаў інтэрпрэтацыі і канстатацыі фактаў СМІ. Вынікі даследавання ўвасоблены ў навуковых артыкулах, дакладах і тэзісах навуковых канферэнцый.

Акрамя таго, супрацоўнікі кафедры паглыбляюць індывідуальна абраныя сферы даследчай дзейнасці. Гэта дае спадзяванне, што ў хуткім часе кафедра папоўніцца новымі кандыдатамі і дактарамі навук. Сведчаннем навуковага патэнцыялу кафедры з’яўляюцца манаграфіі: Т. М. Дасаева. Паэтыка лірызму ў беларускай прозе. – Мн., 2001., Максім Гарэцкі і Янка Брыль. Тыпалогія малых жанраў. – Мн., 2004; Т. С. Студенко. Преобразование реалистической системы Г. Флобера в творчестве Г. Джеймса. – Мн., 2000.

Калектыў кафедры клапоціцца пра метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу. За апошнія гады надрукавана сем метадычных і вучэбна-дапаможных выданняў: Е. И. Кононова. Инфраструктура и технология зарубежных СМИ, Как писать курсовую работу; И. И. Саченко. Печать Китая после образования КНР, Информационное агентство Китайской Народной Республики Синьхуа; И. И. Саченко, Е. Ф. Конев. Международная журналистика. Введение в специальность; Я. Ф. Конеў. Трансфармацыя інфармацыйнай прасторы краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Арганізацыя навукова-даследчай працы сярод студэнтаў – перспектыўны напрамак дзейнасці кафедры, які дапамагае ў справе падрыхтоўкі маладых выкладчыцкіх кадраў. Работы студэнтаў спецыяльнасці “міжнародная журналістыка” неаднаразова адзначаліся на рэспубліканскіх аглядах студэнцкіх навуковых даследаванняў. Лепшым сваім выпускнікам кафедра дае рэкамендацыі для паступлення ў аспірантуру.

За 20 гадоў свайго існавання кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры стварыла трывалую тэарэтычную, метадалагічную і навукова-практычную базу для падрыхтоўкі спецыялістаў новай кваліфікацыі. І, трэба сказаць, яны запатрабаваныя ў сучасным грамадстве. У першую чаргу гэта звязана з пашырэннем самой інфармацыйнай прасторы, а таксама кантактаў і разнастайных сувязяў Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі. Сённяшнія журналісты-міжнароднікі павінны быць здольнымі не толькі паведамляць аб падзеях міжнароднага жыцця, але і аналізаваць, тлумачыць інфармацыю з улікам асаблівасцей яе ўспрымання прадстаўнікамі розных культур у кантэксце пастаянна зменлівай рэчаіснасці. З другога боку, менавіта журналіст-міжнароднік будзе прадстаўляць нашу краіну падчас сваёй непасрэднай працы па збору інфармацыі і ажыццяўленні кантактаў з замежнымі культур-

нымі, грамадскімі і палітычнымі дзеячамі. Па ім, яго ведах аб сваёй краіне, агульным узроўні эрудыцыі будуць меркаваць аб нашай краіне, беларускай нацыі, яе гісторыі і культуры.

Кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры, як і факультэт журналістыкі ў цэлым, улічвае гэтую шматграннасць і універсальнасць журналісцкай дзейнасці, таму ў праграме навучання журналістаў-міжнароднікаў асаблівае месца займаюць такія дысцыпліны, як “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”, “Гісторыя Беларусі”, “Гісторыя беларускай журналістыкі”, “Нацыянальная ідэя і станаўленне беларускай дзяржаўнасці”, “Геапалітычныя канцэпцыі сучаснага развіцця”, “Гісторыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь”.

Прыемна ўсведамляць, што беларуская мова на кафедры міжнароднай журналістыкі і літаратуры з’яўляецца не толькі мовай справаводства, але і мовай навуковых, творчых выданняў. Яна актыўна ўжываецца выкладчыкамі і студэнтамі на лекцыйных і практычных занятках. А менавіта родная мова – дзейсны сродак абуджэння нацыянальнай самасвядомасці. Сведчанне гэтаму на пачатку XXI ст. – прызнанне нацыянальнай ідэі як асновы беларускай дзяржаўнасці. У бліжэйшай будучыні нацыянальная ідэя можа стаць неад’емнай часткай самасвядомасці новых пакаленняў, духоўнай асновай годнага жыцця Рэспублікі Беларусь у міжнародным супольніцтве. Кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры мэтанакіравана і плённа садзейнічае гэтаму працэсу.

***Т. М. ДАСАЕВА,***
***загадчык кафедры***
***замежнай журналістыкі і літаратуры***

**На здымках:** удзельнікі Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Журналістыка – 2003»




*Удзельнікаў канферэнцыі сустракае намеснік дэкана па навуковай працы дацэнт А. І. Конанава (на здымку справа)*



*Прафесар Інстытута журналістыкі Кіеўскага нацыянальнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі Н. М. Сідарэнка і заг. кафедры міжнароднай журналістыкі і літаратуры прафесар Т. М. Дасаева*



*Галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня» З. К. Прыгодзіч і прафесар І. І. Сачанка*

# Новай адукацыі – новыя тэхналогіі



З 1994 года факультэт журналістыкі актыўна прымаў удзел у міжнароднай праграме "Тэмпус", мэтай якой было адкрыццё спецыяльнасці "Інфармацыя і камунікацыя". У супрацоўніцтве з універсітэтамі Францыі (Экс – Марсэль II і Універсітэт імя Стэндаля (Грэнобль) і Вялікабрытаніі (Хамберсайт) выкладчыкі факультэта распрацавалі вучэбны план і стандарт новай спецыяльнасці.

У верасні 1996 года на факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта прыйшлі першыя 30 студэнтаў "інфармацыі і камунікацыі".

З 1997 года студэнты спецыяльнасці "інфармацыя і камунікацыя" паспяхова праходзяць вучэбна-вытворчую практыку ў сродках масавай інфармацыі, цэнтрах па сувязях з грамадскасцю, рэкламных агенцтвах, інтэрнэт-выданнях.

Аднак ужо праз год пасля адкрыцця спецыяльнасці былі заўважаны пэўныя цяжкасці ў навукова-метадычным забеспячэнні новага накіравання. Адрозненне вучэбных планаў, праграм практыкі, мэт і задач падрыхтоўкі ад аналагічных пытанняў спецыяльнасці "журналістыка" патрабавала стварэння асобнай, спецыялізаванай выпускаючай кафедры.

У адпаведнасці з рашэннем Савета універсітэта 26.04.99 г. была адкрыта кафедра тэхналогій камунікацыі. Пад назвай "тэхналогіі камунікацыі" маецца на ўвазе як асабіста тэхналагічныя аспекты камунікацыі, так і сацыяльныя камунікацыйныя тэхналогіі. У навуковую і вучэбныя праграмы кафедры ўвайшлі курсы, якія знаходзяцца як у традыцыйным полі жуналістыкі, так і па-за ім, але тым не менш звязаныя з камунікацыяй. Асноўная ўвага звяртаецца на такія дысцыпліны, як "Асновы інфармацыйна-камунікацыйнай дзейнасці", "Тэорыя інфармацыі і камунікацыі", "Найноўшыя камунікацыйныя тэхналогіі", "Палітычная камунікацыя", "Праграмнае забеспячэнне мультымедыйных тэхналогій", "Семіялогія", "Сацыялогія камунікацыі" і інш. Усяго кафедра забяспечвае правядзенне 52 курсаў, спецкурсаў і спецсемінараў.

У маі 2001 года кафедра ўпершыню ўдзельнічала ў прыёме дзяржаўнага экзамену і абароне дыпломных работ выпускнікоў спецыяльнасці "Інфармацыя і камунікацыя".

У чэрвені 2001 года адбыўся першы выпуск студэнтаў з кваліфікацыяй "спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі", падрыхтаваны кафедрай тэхналогій камунікацыі факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта.

Першым загадчыкам кафедры стаў дацэнт кафедры тэлебачання і радыёвяшчання, канды-

дат філалагічных навук В. Р. Вашкевіч. Вопытны выкладчык, актыўная ўдзельніца праграмы “Тэмпус”, кандыдат мастацтвазнаўства Н. Ц. Фральцова шмат намаганняў прыклала да вызначэння накірункаў дзейнасці кафедры. У 2003 г. Н. Ц. Фральцова абараніла доктарскую дысертацыю “Тыпалогія творчай дзейнасці ў аўдыёвізуальнай камунікацыі” і з 2004 г. працуе на пасадзе прафесара. З маладых выкладчыкаў варта назваць кандыдата філасофскіх навук І. У. Сідорскую, кандыдата філалагічных навук А. І. Салаўёва, старэйшых выкладчыкаў І. П. Шыбут і Т. А. Ягелу.

Сярод пазаштатных выкладчыкаў кафедры многія дасягнулі значных прафесійных поспехаў у галіне камунікацыі. Напрыклад, У. М. Граўцоў кіруе інфармацыйным агенцтвам “Агенцтва Граўцова”, І. М. Сакалоў – галоўны рэдактар газеты “АіФ у РБ”, А. У. Лапцёнак узначальвае Асацыяцыю PR-спецыялістаў у РБ.

За 2000–2004 нав. г. надрукавана 32 адзінкі метадычных і вучэбна-дапаможных выданняў. Так, у 2002 г. выйшаў дапаможнік “Камунікацыя ў арганізацыях” (І. У. Сідорская), вучэбныя дапаможнікі “Асновы камп’ютэрных тэхналогій у адукацыі” ў 4-х ч. (І. П. Шыбут у сааўт.), метадычныя ўказанні па лабараторных работах “Праграмнае забеспячэнне мультымедыйных тэхналогій” (І. П. Шыбут), метадычны дапаможнік “Я вывучаю Corel Draw 9” (Т. А. Ягела); у 2004 г. В. Р. Вашкевічам і І. П. Шыбут падрыхтаваны ВМК “Навейшыя камунікацыйныя тэхналогіі”; выдадзены ВМК “Асновы інфарматыкі” (Т. А. Ягела); у 2005 годзе плануюцца да выхаду ВМК “Палітычная камунікацыя”, “Асновы інфармацыйна-камунікацыйнай дзейнасці” (А. І. Салаўёў), “Камп’ютэрная вёрстка” (Т. А. Ягела), “Маркетынг PR” (І. У. Сідорская).

Філіялам кафедры па арганізацыі і правядзенні практыкі з’яўляецца Нацыянальны прэсцэнтр РБ. Асноўнымі базамі практыкі вызначаны: Прэс-цэнтр Дома прэсы, інфармацыйнае агенцтва “Агенцтва Граўцова”, выставачны цэнтр “Экспафорум”, Упраўленне інфармацыяй МУС РБ, Упраўленне інфармацыяй МЗС РБ, НДТРК, тэлекампанія “ФІТ”, рэдакцыі рэгіянальных і рэспубліканскіх друкаваных і электронных СМІ і інш. установы.

Аптымальная колькасць вытворчых практык дазваляе студэнтам вызначыць сваю прафесійную схільнасць і свядома выбраць сваё першае працоўнае месца. Дакументы камісіі па дзяржаўным размеркаванні выпускнікоў спецыяльнасці “інфармацыя і камунікацыя” сведчаць, што абсалютная большасць маладых спецыялістаў накіроўваюцца ў дзяржаўныя структуры і ўстановы.

Па даручэнні Адміністрацыі Прэзідэнта РБ прафесар кафедры тэхналогій камунікацыі Н. Ц. Фральцова сумесна з інстытутам сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта РБ на працягу 2003–2004 гг. аналізавала работу беларускіх тэлевізійных каналаў. Па выніках даследавання адзначаны станоўчыя змены ў дзейнасці вядучых тэлевізійных каналаў краіны.

Сёння, у 2004 годзе, слова “камунікацыя” ўжо не выклікае таго здзіўлення, якое было бачна на тварах чыноўнікаў у 1996 годзе. Грунтуючыся як на ўласных традыцыях, так і на вопыце еўрапейскіх універсітэтаў, мы за апошнія 6 гадоў змаглі пабудаваць дастаткова лагічную сістэму курсаў і спецкурсаў, якія павінны даць студэнтам неабходныя навыкі. Гэта адзначаюць і нашы заходнія калегі, якія рэгулярна бываюць у Белдзяржуніверсітэце. Тым не менш, попыт на спецыялістаў у галіне інфармацыі і камунікацыі ў нашай краіне застаецца нізкім, таму што многія дзяржаўныя структуры не бачаць пакуль неабходнасці ў наладжванні сувязей з грамадскасцю. Аднак кафедра тэхналогій камунікацыі з аптымізмам глядзіць у будучыню і верыць, што яе выпускнікі зоймуць пачэснае месца сярод іншых спецыялістаў у галіне камунікацыі.

***В. Р. ВАШКЕВІЧ,***
***загадчык кафедры***
***тэхналогій камунікацыі***

# З мовай праз усё жыццё

За трыццацігадовае існаванне кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання шмат зрабіла для развіцця беларускай лінгвістыкі, станаўлення культуры маўлення і фарміравання асобнай галіны прафесійнай дзейнасці – тэорыі і практыкі рэдагавання. З веснічак кафедры атрымала жыццё айчынная стылістыка. У працах першага загадчыка кафедры, слыннага вучонага, Заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктара філалагічных навук, прафесара М. Цікоцкага закладзены асновы стылістыкі як навукі і прыкладной дысцыпліны, вызначаны прыярытэтныя шляхі яе развіцця, удасканалення даследаванняў у рэчышчы стылістыкі жанраў, стылістыкі тэксту. Гэта сімвалічна перакідае масток у міждысцыплінарнае вывучэнне тэксту як своеасаблівай іерархіі ведаў, змястоўна папаўняе мовазнаўчую навуку, натхняе маладых на пошукі адметнага і выразнага, каштоўнага і трапнага ў вывучэнні роднай мовы.

На сёння кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання – навукова-даследчае, навучальнае структурнае падраздзяленне, якое забяспечвае лінгвастылістычную падрыхтоўку студэнтаў факультэта журналістыкі, сістэмна вывучае генезіс публіцыстычнага маўлення, дывергентнасць і канвергентнасць яго ва ўмовах білінгвізму, вядзе фундаментальныя распрацоўкі ў галіне беларускай стылістыкі, даследуе праблемы маўленчай камунікацыі. З 2004 года кафедра стала выпускаючай: напярэдадні 60-гадовага юбілею факультэта журналістыкі адбыўся першы выпуск студэнтаў спецыяльнасці «літаратурная работа» спецыялізацыі «літаратурнае рэдагаванне». Да 1999 года ў Рэспубліцы Беларусь не вялася падрыхтоўка спецыялістаў журналісцкага профілю ў галіне тэорыі і практыкі рэдагавання. Кафедральны калектыў прыкладае шмат намаганняў для дасягнення аптымальнага варыянту прафесійнай падрыхтоўкі будучых рэдактараў і вядзе творчы пошук змястоўнага напаўнення навучання іх, зыходзячы з білінгвістычнай сітуацыі ў краіне.

Юбілей факультэта кафедра сустракае ў абноўленым складзе: за апошнія гады на кафедру прыйшло шэсць кандыдатаў філалагічных навук, якія паспяхова асвойваюць спецыфіку вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці. Двое з іх абаранілі дысертацыі на кафедры. Такім чынам, у кафедральным калектыве сёння наглядаецца спалучанасць шматгадовага вопыту, мудрасці, педагагічнага майстэрства і энергічнасці, навуковага запалу, метадычных знаходак.

Доўгі час на кафедры працавалі, аддаючы свае сардэчнае цяпло і веды, прафесар А. Наркевіч і старшы выкладчык М. Каваленка. Ім і



памяці пра іх кафедра прысвяціла рэспубліканскія чытанні «Слова ў кантэксце часу» (2004 г.) і творчую сустрэчу-прэзентацыю «Душа Радзіме просіцца служыць» (2004 г.).

Плён працы Аркадзя Іосіфавіча прарос добрым зернем на навуковай глебе нашай краіны. Сваім спадчыннікам ён пакінуў амаль чатырыста прац. Яны знітоўваюцца ў адну вялікую кнігу, што паўстае перад пакаленнямі велічным гмахам вучонасці, навуковай руплівасці і дбайнасці, але зайсці ў яго наканавана не кожнаму. Толькі таму, хто мае ўлюбёнасць у слова, дасягнуў адчування сваёй Айчыны, мовы, раскрыецца гэтая скарбніца Наркевічавых думак і памкненняў. А значыць ён працаваў на сёння і на будучае. Як клапатлівы бацька, люляў сваё немаўля, спадзеючыся, што хутка вырасце яно, загаворыць у поўны голас, акрыяе...

Своеасаблівым гімнам жыцця Міколы Рыгоравіча Каваленкі сталі словы аднаго з яго вершаў – «Душа Радзіме просіцца служыць…». Уплеценыя ў жыццёвы карагод таленавітага педагога, адмысловага руплівца пра родную мову, яны быццам запрашаюць жыць, радавацца сонцу, клічуць да любові, кахання і згоды. Кафедра падчас сустрэчы прэзентавала зборнік вершаў выдатнага педагога. Яны маюць выразную адметнасць – напоўненасць жыццём. Жыццёвая энергія вершаваных радкоў кранае глыбока, пераканаўча засведчвае пераможную моц слова – над лёсам, побытам, смерцю. У іх выразна адбіваецца сутнасць асобы Міколы Рыгоравіча, існасць яго характару. Такія вершы мог ствараць толькі перакананы жыццялюб і чалавек, улюбёны ў людзей, у сваю працу, у песню, у родную Беларусь.

Яны заўчасна пакінулі нас... Кафедра ганарыцца гэтымі людзьмі.

Навукоўцамі кафедры выконваюцца дзве навуковыя тэмы, распрацоўка якіх з’яўляецца важнымі звёнамі развіцця беларускага мовазнаўства. У рамках выканання планавай кафедральнай тэмы выпрацоўваюцца канцэптуальныя падыходы да вывучэння маўленчага факта як функцыянальнага прэзентанта камунікатыўных установак аўтара, знаходжання якасных спосабаў уплыву на рэцыпіента, вылучэння прагматычнай функцыі і рэалізацыі яе кампанентаў у публіцыстычным тэксце.

Разгляд сістэмных структурных адзінак тэксту ў стылістычным аспекце дазваляе пераарыентаваць моўнае навучанне з структурнасістэмнага на функцыянальна-камунікатыўнае. У працяг выдадзеных прафесарам М. Цікоцкім прац па стылістыцы беларускай мовы створаны «Практыкум па стылістыцы беларускай мовы. Частка I» (2001 г., аўтары – М. Я. Цікоцкі, А. М. Цікоцкі), падручнік «Стылістыка тэксту» (2002 г., аўтар – М. Я. Цікоцкі), у друку знаходзіцца «Практыкум па стылістыцы беларускай мовы. Частка II» (аўтары – М. Я. Цікоцкі, А. М. Цікоцкі).

Паводле рашэння конкурснай камісіі НАН Беларусі па адбору заданняў у Дзяржаўную праграму фундаментальных даследаванняў на 2001–2005 гг. «Беларуская мова» на кафедры выконваецца навуковая праца «Даследаванне мовы і стылю сродкаў масавай інфармацыі на мяжы тысячагоддзяў» (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук В. І. Іўчанкаў). Праводзіцца вывучэнне спосабаў і прыёмаў маўленчага адлюстравання, дыягностыкі асобасных адносін, замацаваных на лінгвістыцы падману, прадуцыравання ў рэальных адносінах псеўдаінфармацыі і камунікатыўнай яе недастатковасці, даецца аналітычнае апісанне прычын і ўмоў узмацнення лексічнай ацэначнасці (прэзентацыя гатовай ацэнкі), трансфармацыі тыпаў выкладання (замена аналітычнага тыпу інфармацыйна-апісальным); ствараецца агульная мадэль стылістычнага і жанрава-камунікацыйнага функцыянавання сродкаў маўлення ў прэсе, на радыё і тэлебачанні.

У 2003 годзе на кафедры была абаронена доктарская дысертацыя на тэму «Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту», што надало новы імпульс станаўленню кафедральнай даследчай школы.

З улікам навуковых распрацовак і набыткаў у рэчышчы названых даследаванняў ство-

раны і выдадзены вучэбна-метадычны комплекс «Сучасная беларуская мова» (2001 г., аўтар – прафесар В. І. Іўчанкаў), 2 часткі вучэбна-метадычнага комплекса «Сучасная руская мова» (аўтар – дацэнт А. А. Рудэнка).

Шчыруюць у студэнцкай аўдыторыі, перадаючы вопыт і веды, замілаванне родным словам дацэнты М. Карповіч, А. Хромчанка, В. Горбач, В. Самусевіч, Ю. Лук'янюк, Л. Хартановіч, Г. Басава і старшы выкладчык В. Дз. Бардзіян. Строгая акрэсленасць ва ўнармаванні мовы, клопат пра павышэнне рускамоўнай маўленчай культуры ва ўмовах білінгвізму вылучае працу дацэнтаў А. Рудэнкі і В. Дзесюкевіч. Прыемна чуць узнёслыя словы ўдзячнасці ад замежных студэнтаў з розных краін свету на адрас старшых выкладчыкаў Л. Сачанкі і Т. Канюшкевіч.

У гэтым годзе ў калектыў кафедры годна ўвайшла наша сёлетняя выпускніца Вольга Базылёва, наш першы прафесійны літаратурны рэдактар. Да таго ж, і паэтка, якая ў свае 22 гады стала членам Саюза беларускіх пісьменнікаў. Вольга Уладзіміраўна – прадстаўніца першага выпуску па нашай кафедральнай спецыяльнасці "літаратурная работа".

Зладжаная праца калектыву кафедры засведчваецца ў разнастайнасці новых курсаў, спецкурсаў, якія ўводзяцца ў навучальны працэс і грунтуюцца на сучасных набытках лінгвастылістыкі. Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню моўнага сродку як тэкстаўтваральнага фактару. Публіцыстычны тэкст вывучаецца шматаспектна і прафесійна арыентавана ў спецыяльных курсах і семінарах «Эстэтыка слова» (прафесар М. Цікоцкі), «Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту» (прафесар В. Іўчанкаў), «Супастаўляльная стылістыка беларускай і рускай моў і практыка перакладу» (дацэнт М. Карповіч), «Рэдагаванне старажытных рукапісаў» (прафесар А. Булыка), «Канцэптуальны аналіз мастацкага тэксту» (дацэнт В. Дзесюкевіч), «Лагасфера беларускіх СМІ» (дацэнт В. Самусевіч).

Выкладчыкамі кафедры створана, папаўняецца і абнаўляецца навукова-метадычная база для падрыхтоўкі першых у рэспубліцы спецыялістаў па літаратурным рэдагаванні. У гэтым напрамку рупліва працуюць намеснік дэкана А. Рудэнка, дацэнты М. Карповіч, В. Горбач, Т. Салавянчык, А. Хромчанка.

Кафедра актыўна ўдзельнічае ў навуковым, даследчым і метадычным жыцці факультэта, універсітэта, рэспублікі. Члены кафедры сістэматычна запрашаюцца на апаніраванне саветамі па абароне дысертацый спецыяльнасцей 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.02 – руская мова, 10.02.10 – журналістыка (Гомельскі дзяржаўны універсітэт, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка, Беларускі дзяржаўны універсітэт).

Выкладчыкі супрацоўнічаюць са шматлікімі рэдакцыямі рэспубліканскага друку, радыё і тэлебачання, аказваюць ім кансуль-



*Шчырая размова аб прафесійнай падрыхтоўцы літаратурных рэдактараў*

тацыйную дапамогу, рэгулярна друкуюцца па надзённых пытаннях культуры маўлення, лінгвадыдактыкі і адукацыі. Актыўны ўдзельнік тэлевізійнага жыцця дацэнт М. Карповіч гартуе моц прафесійнага слова, прыкладаючы шмат намаганняў дзеля павышэння маўленчай культуры нацыянальнага тэлебачання. Пашырае моўны кругагляд і спрабуе свае даследчыя сілы студэнцкая творчая лабараторыя «Стыліст» пад кіраўніцтвам дацэнта В. Дзесюкевіч. Непасрэдная сувязь наладжана з рэдакцыямі навукова-метадычных часопісаў «Роднае слова» і «Беларуская мова і літаратура», у якіх рэгулярна друкуюцца выкладчыкі кафедры, з выдавецтвамі «Пачатковая школа», «Адукацыя і выхаванне».



*Экзамен па сучаснай рускай мове прымае дацэнт А. А. Рудэнка*



*На творчую сустрэчу-прэзентацыю, прысвечаную 70-годдзю з дня нараджэння М. Р. Каваленкі, завітаў калектыў народнага хору Белдзяржуніверсітэта «Родніца»*

Выразнае адчуванне калегамі навізны і зменлівасці ў мове, тэндэнцый і заканамернасцей развіцця навукі ствараюць трывалы падмурак метадалагічнай, тэарэтычнай і прыкладной базы выкладання моўных дысцыплін на факультэце.

Кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання поўніцца задумамі і цікавымі ідэямі. Навуковы і творчы патэнцыял кафедры дазваляе вырашаць надзённасці лінгвастылістычнай, рэдактарскай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у галіне журналістыкі. Асноўнай задачай на сённяшні выкладчыцкі калектыў бачыць стварэнне нацыяльнальных падручнікаў па сучаснай беларускай мове, рэдагаванні. У перспектыўны план кафедры на бліжэйшы час унесены пазіцыі па стварэнні вучэбна-метадычных комплексаў па асноўных дысцыплінах кафедры.

З упэўненасцю можна сказаць, што выкладчыкі кафедры ўяўляюць сабой зладжаны навуковы калектыў, які мацуе лепшыя традыцыі, узбагачае айчыннае мовазнаўства яскравымі тэарэтычнымі і метадалагічнымі знаходкамі.

**В. І. ІЎЧАНКАЎ,**
***загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання***

# *Гарызонты гістарычнай навукі*

Кафедра гісторыі журналістыкі і літаратуры – старэйшая на факультэце. Адлік сваёй уласнай гісторыі яна пачала амаль чатыры дзесяцігоддзі таму, калі ў 1965 г. узнікла аб'ектыўная неабходнасць падзелу кафедры журналістыкі на два навукова-выкладчыцкія калектывы. Так былі створаны кафедры гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі журналістыкі. Загадчыкам кафедры гісторыі журналістыкі быў абраны кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. С. Зярніцкі. На кафедры склаўся таленавіты калектыў выкладчыкаў і навукоўцаў: канд. гіст. навук, дацэнт Р. В. Булацкі, канд. філал. навук, дацэнт Н. А. Сніцарава, ст. выкладчык А. М. Апелінская, выкладчык С. В. Говін.

Рыгор Васільевіч Булацкі па праву лічыцца адной з самых яркіх постацей на небасхіле айчыннай гістарычнай навукі. Яго жыццёвы і творчы шлях адлюстраваны ў кнізе А. Марціновіча «Есть имена, которые не забываются», аднак і ў нашым артыкуле ўзгадаем асноўныя вехі жыцця выдатнага навукоўца і арганізатара школы айчыннай журналістыкі. Нарадзіўся Рыгор Васільевіч на Бабруйшчыне, дзе скончыў вясковую сярэднюю школу. У гады вайны Р. В. Булацкі ваяваў на фронце ў авіяцыі, пасля вайны быў студэнтам аднаго з першых набораў факультэта журналістыкі. Гады навуковай і вучэбнай працы сфарміравалі з яго нястомнага даследчыка актуальных праблем гісторыі журналістыкі.

Марк Саламонавіч Зярніцкі – адзін са старэйшых выкладчыкаў кафедры, выдатны педагог і даследчык, аўтар шэрагу манаграфій і даследаванняў па гісторыі журналістыкі. Удзельнік грамадзянскай вайны, журналісцкую дзейнасць пачаў яшчэ у 20-я гг. XX ст., да вайны працаваў у Камуністычным інстытуце журналістыкі БССР імя С. М. Кірава загадчыкам кафедры друку. Даследаваў дзейнасць публіцыстаў рэвалюцыйнага часу, аўтар манаграфіі «Великий мастер публицистики» (1971 г.). Многія выхаванцы журфака памятаюць яго лекцыі па гісторыі журналістыкі, дзе асаблівая ўвага адводзілася гісторыі «Звязды» – старэйшага беларускага выдання.

Ніна Аляксандраўна Сніцарава – студэнтка першага выпуску 1949 г., рамантычная зорка выкладчыцкага калектыву факультэта, якая ззяе вось ужо 51 год! Абпаленае ваенным ліхалеццем юнацтва, вучоба ў цяжкія для краіны гады на толькі што створаным факультэце



журналістыкі – гэта толькі штрыхі з яе жыццёвай біяграфіі. На працягу сваёй выкладчыцкай дзейнасці падрыхтавала незлічоную колькасць заўзятараў і папулярызатараў публіцыстычных твораў рускай журналістыкі ў абсягах нашай Айчыны і за яе межамі.

Выкладчыцкі калектыў кафедры гісторыі журналістыкі, у які і ў наступныя гады і дзесяцігоддзі ўліваліся выдатныя педагогі, адораныя талентам даследчыкаў, – канд. гіст. навук, дацэнт А. І. Раковіч, канд. гіст. навук, дацэнт А. Г. Слука, канд. гіст. навук, дацэнт І. І. Сачанка, – быў патэнцыяльна здольны вырашаць досыць складаныя задачы па стварэнні глыбока і ўсебакова распрацаваных курсаў па гісторыі беларускай і рускай журналістыкі, забяспечаных праграмамі, вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, падручнікамі і хрэстаматыямі, дзе былі б сабраныя лепшыя творы нацыянальнай публіцыстыкі.

Важнымі вехамі навукова-даследчай працы сталі манаграфіі Р. В. Булацкага: «Первые рабселькоры Белоруссии», 1969 г.; «Кузьма Чорны – публіцыст», 1972 г. (сааўт. – І. І. Сачанка); «Платон Галавач – публіцыст», 1973 г. (сааўт. – Э. А. Карніловіч), «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай савецкай публіцыстыкі», 1974 г. (сааўт. – І. І. Сачанка). Каштоўным укладам у вывучэнне гісторыі заходнебеларускай журналістыкі стала манаграфія С. В. Говіна «Друк Заходняй Беларусі» (1974 г.). Упершыню звесткі аб кнігавыдавецкай дзейнасці ў савецкай Беларусі былі сістэматызаваныя ў манаграфічнай працы А. І. Раковіча «Книгоиздательское дело в Белоруссии», 1977 г. (сааўт. – А. А. Волк). Распрацоўкай актуальных праблем маладзёжнага друку займаўся А. Г. Слука, які выдаў шэраг манаграфій («Ф. Э. Дзержинский и печать», 1977 г.; «Голос революционной молодёжи», 1978 г.; «Комсомольская строка», 1984 г.), абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Праблемы развіцця камсамольскага друку Беларусі і яго роля ў будаўніцтве сацыялізма» (1986 г.).

Фундаментальныя працы і даследаванні па гісторыі журналістыкі неўзабаве зрабілі магчымым стварэнне сіламі выкладчыкаў кафедры першага падручніка па гісторыі беларускай журналістыкі, які ахапіў увесь перыяд развіцця айчыннага друку з моманту яго зараджэння да нашых дзён. У 1979 г. на кафедры выпушчаны першы фундаментальны падручнік «Гісторыя беларускай журналістыкі» (аўтары Р. В. Булацкі, І. І. Сачанка, С. В. Говін за яго стварэнне ў 1980 г. атрымалі званне Лаўрэатаў прэміі Саюза журналістаў СССР).

На кафедры пэўны час працавалі кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. І. Сачанка, кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. І. Конанава. У 1988 г. прафесар А. Г. Слука абраны загадчыкам кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры. За 10 гадоў на кафедры адбыліся кардынальныя змены ў змесце выкладаемых дысцыплін, пад кіраўніцтвам прафесара А. Г. Слукі абаронены 16 кандыдацкіх дысертацый, дацэнта С. В. Говіна – 1 кандыдацкая дысертацыя. Членамі выкладчыцкага калектыву сталі П. Л. Дарашчонак (у 1993 г. абараніў дысертацыю на тэму «Станаўленне і развіццё мясцовага друку Беларусі (1918–1925 гг.)», Дз. М. Драздоў (кандыдацкую дысертацыю на тэму «Прэса Беларусі: праблемы і супярэчнасці развіцця ў працэсе дэмакратызацыі грамадства 1985–1990 гг.» абараніў у 1995 г.), пазней – Н. А. Зубчонак (абараніла ў 2001 г. кандыдацкую дысертацыю «Беларускі друк у перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906–1917 гг.)». У гэты перыяд створана новае пакаленне вучэбна-метадычных дапаможнікаў: «Беларуская журналістыка. У 3-х частках» (1991, 1993, 1996), «Белорусская журналистика (1563–1917 гг.)» для студэнтаў замежнага аддзялення.

Шасцідзесяцігоддзе факультэта журналістыкі кафедра сустракае новымі навуковымі і творчымі дасягненнямі, найбольш важкім з якіх з'яўляецца выхад у 2000 і 2002 гг. двух частак вучэбна-метадычнага дапаможніка А. Г. Слукі «Беларуская журналістыка. У 3-х частках», вучэбна-метадычнага комплекса С. В. Говіна «Беларуская журналістыка (1563–1917 гг.)» (2002 г.), манаграфіі А. Г. Слукі «Нацыяналь-



*Лекцыю па гісторыі беларускай журналістыкі чытае дацэнт С. В. Говін*

ная ідэя: сістэмны аналіз праблемы» (2001 г.). Адначасова са стварэннем новага пакалення падручнікаў па гісторыі айчыннай журналістыкі навукова-даследчыцкія інтарэсы выкладчыкаў закранаюць праблемы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі ў творчасці айчынных публіцыстаў, пытанні развіцця беларускай дзяржаўнасці ў друку рэвалюцыйнага перыяду. Больш глыбока і дэталёва актуальныя праблемы гісторыі і сучаснасці айчыннай перыёдыкі вывучаюцца ў новых спецкурсах кафедры – «Праблемы беларускай дзяржаўнасці ў СМІ», «Эканамічная рэформа і СМІ Рэспублікі Беларусь», «СМІ Беларусі ў нацыянальным дэмакратычным працэсе», «Канфесійны друк у Беларусі», «Сучасная айчынная і замежная кнігавыдавецкая справа».

Сёння кафедра гісторыі журналістыкі і літаратуры – гэта навукова-даследчае, навучальнае структурнае падраздзяленне, якое вядзе распрацоўку гістарычных і сучасных праблем нацыянальных сродкаў масавай камунікацыі, дае студэнтам факультэта журналістыкі неабходныя веды па гісторыі беларускай і рускай журналістыкі, шэрагу іншых дысцыплін, у тым ліку сацыяльна-гуманітарнага блоку.

Абапіраючыся на багаты вопыт дзейнасці айчыннай журналістыкі, мы на гістарычных уроках мінулага вучымся канструктыўна і творча развіваць сучасныя сродкі масавай інфармацыі.

***П. Л. ДАРАШЧОНАК,***
***загадчык кафедры***
***гісторыі журналістыкі і літаратуры***

# *Ведаць замежную мову – да гонару журналіста*

**К**афедра англійскай мовы і маўленчай камунікацыі працуе з 1999/2000 навучальнага года. Секцыяй англійскай мовы факультэта журналістыкі кіруе старшы выкладчык Наталля Мікалаеўна Корзюк. У склад секцыі ўваходзяць старшыя выкладчыкі Л. В. Ваўкавінская, Т. А. Сітнікава, С. Г. Няшына, А. П. Смыкоўская, Н. М. Мацур, І. У. Пасюкевіч, В. У. Лушчынская, А. Н. Радзівон, П. Л. Салаўёў, М. М. Аднаклубава. Сёлета секцыя папоўнілася выкладчыкамі Т. А. Макоўскай і А. У. Паповай.

Для ўдасканалення майстэрства выкладчыкаў англійскай мовы і з мэтай аптымізацыі працэсу навучання на кафедры стажыраваліся і працавалі ў розны час замежныя спецыялісты – прафесар Байран Рэнц, доктар філасофіі Біл Уосмунд, магістр Брэнда Уосмунд.

Сем выкладчыкаў працуюць над напісаннем кандыдацкіх дысертацый па такіх накірунках, як методыка выкладання замежнай мовы, замежная літаратура, агульнае мовазнаўства, сацыялогія: В. У. Лушчынская, А. Н. Радзівон, Т. А. Макоўская, І. У. Пасюкевіч, А. У. Папова, П. Л. Салаўёў, А. П. Смыкоўская.

Выкладчыкі прымаюць актыўны ўдзел у разнастайных навуковых, навукова-метадычных і навукова-практычных канферэнцыях як у Беларусі, так і за яе межамі (Расія, Украіна, Літва, Польшча, Швецыя, Іспанія, Вялікабрытанія, Нарвегія, Францыя, Германія).

Кафедра знаходзіцца ў стане якаснага росту. Аб гэтым гаворыць спіс аспірантаў і суіскальнікаў кафедры. Але ўжо зараз можна сказаць, што гэта калектыў прафесіяналаў. Члены кафедры актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах Цэнтра замежных моў БДУ, у тым ліку ў стварэнні ВМК новага пакалення, штогод праводзяць адкрытыя заняткі, дэманструючы добрую якасць педагагічнай працы. На кафедры ёсць група перакладчыкаў-сінхраністаў, якія заўсёды дапамагаюць міжнароднаму аддзелу універсітэта пра-



водзіць міжнародныя сустрэчы на належным узроўні.

Навучанне англійскай мове складаецца з двух кампанентаў – *агульная англійская мова* (General English) і *англійская мова для спецыяльных мэтаў* (ESP). У працэнтных адносінах размеркаванне навучальнага часу паміж аспектамі агульнай і спецыяльнай англійскай мовы адбываецца ў роўных прапорцыях.

*Адказная за работу па аспекце «Агульная англійская мова» Наталля Мікалаеўна Корзюк:*

– Праца ў межах агульнага курса ахоплівае разнастайную тэматыку бытавой і грамадска-палітычнай накіраванасці, адлюстроўвае спецыфіку зносін на ўсіх узроўнях: міжасобасным, у групах, на масавым узроўні. Студэнты развіваюць і ўдасканальваюць навыкі вуснага маўлення, аўдзіравання, чытання і пісьма па самай рознай праблематыцы – па праблемах узаемаадносін у сям'і і студэнцкім асяроддзі, пытаннях сістэмы вышэйшай адукацыі, дзяржаўнага ладу і палітычных сістэм Беларусі і англамоўных краін, па актуальных пытаннях пражывання ў сусветнай супольнасці з улікам міжкультурнай камунікацыі. Абмяркоўваецца становішча Беларусі ў сусветнай супольнасці, пытанні гендэрнай палітыкі, праблемы індывіда ў сучасным грамадстве.

Выкладчыкі кафедры актыўна ўдзельнічаюць у распрацоўцы навучальна-метадычных матэрыялаў для аптымізацыі навучальнага працэсу. За чатыры гады падрыхтавана і апублікавана дзесяць навукова-метадычных дапаможнікаў, сярод іх – «Зборнік тэстаў, тэставых заданняў і кантрольных работ па англійскай мове», «Грамадазнаўства. Жыццё ў сусветнай вёсцы», «Удасканальвай сваю англійскую мову». Падрыхтавана шэсць метадычных распрацовак і зборнікаў ксеракапіраваных матэрыялаў. Усё гэта з'яўляецца падставай для падрыхтоўкі ВМК новага пакалення.

«Англійская мова для спецыяльных мэтаў» – другі напрамак дысцыпліны «Замежная мова». Яго галоўная мэта заключаецца ў набыцці навучэнцамі спецыяльных ведаў, фарміраванні прафесійных навыкаў і ўменняў ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці праз замежную мову, якая выкарыстоўваецца як сродак падтрымкі і ўзбагачэння гэтых ведаў і ўменняў, што дазваляе эфектыўна адаптавацца да будучай дзейнасці ў кантэксце міжкультурнай камунікацыі. Дадзены напрамак цесна звязаны з прафілюючымі дысцыплінамі, якія вызначаюць змест іншамоўнай адукацыі.

*Адказная за ESP для студэнтаў спецыяльнасці «Журналістыка» Марына Мікалаеўна Аднаклубава:*

– Пры падборы і распрацоўцы тэм для вывучэння найперш улічваюцца прафесійныя мэты журналістаў і практычная карысць матэрыялаў для вывучэння. Так, студэнтам спецыяльнасці «Журналістыка» прапаноўваюцца наступныя тэмы для вывучэння, аналізу і далейшага навуковага даследавання: праца журналіста, прафесійныя якасці журналіста, прафесійная этыка журналіста, падрыхтоўка журналістаў у Вялікабрытаніі і ЗША, класіфікацыя паведамленняў выпускаў навін і асноўныя характарыстыкі розных тыпаў навін, віды друкаваных выданняў, друкаваныя выданні Вялікабрытаніі і ЗША, агульная арганізацыя газеты, структура газетнага артыкула, журналісцкае пісьмо, уплыў тэлебачання на грамадства, тэлебачанне Вялікабрытаніі і ЗША, структура і арганізацыя праграмы навін (на прыкладзе выпуску навін BBC, CNN і EuroNews), мова аўдыёвізуальных СМІ. Пры навучанні мове ў межах будучай прафесіі студэнтаў выкладчыкі шырока выкарыстоўваюць аўдыёвізуальныя сродкі і камп'ютэрныя тэхналогіі. У фондзе кафедры захоўваюцца навучальныя відэафільмы на англійскай мове, аўдыёзапісы, начытаныя носьбітамі мовы – гасцямі кафедры.

*Адказная за ESP для студэнтаў спецыяльнасці «Міжнародная журналістыка» Вольга Уладзіміраўна Лушчынская:*

– Для нашых студэнтаў напрамак «Англійская мова для спецыяльных мэтаў» асабліва важны і значны, паколькі мяркуецца, што яны павінны ажыццяўляць прафесійную дзейнасць на замежнай мове. Для гэтага мы шукаем но-

вые рэзервы, распрацоўваем спецкурсы, запрашаем спецыялістаў з-за мяжы. Так, нашым студэнтам мы прапаноўваем шэраг спецкурсаў, такіх як «Глядзім і аналізуем тэлевізійныя навіны», «Журналісцкае пісьмо», «Ідыёмы ў сродках масавай інфармацыі», «Друкаваныя СМІ: тэхналогіі чытання і пісьма» і інш.



*Заняткі па англійскай мове*

Праца арганізуецца паводле зацверджаных рабочых праграм. На кафедры практыкуецца сістэма здачы выпускнога экзамену па англійскай мове ў выглядзе абароны індывідуальных праектаў, што развівае творчы патэнцыял студэнтаў і ўменне весці даследчую дзейнасць і выкладаць вынікі праведзенага даследавання на замежнай мове, а таксама ажыццяўляць вусную прэзентацыю праекта.

*Адказны за ESP для студэнтаў спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» Павел Леанідавіч Салаўёў:*

– Міждысцыплінарны характар дадзенай спецыяльнасці прадугледжвае атрыманне студэнтамі ведаў, навыкаў і ўменняў у многіх сферах сучаснага жыцця. Будучым спецыялістам неабходныя ўменне публічнага выступлення перад англамоўнай аўдыторыяй, веданне спецыфічных асаблівасцяў арганізацыі інтэрв'ю на радыё/тэлебачанні, дзе ім у большасці выпадкаў давядзецца выступаць у ролі інтэрв'юіруемага, уменне арганізоўваць выставы і прэзентацыі, прэс-ланчы, дні адчыненых дзвярэй, выступаць у ролі прадстаўніка па сувязях з грамадскасцю. Важныя таксама і веданне прынятых за мяжой асноўных прынцыпаў пабудовы прэс-рэлізаў, і ўменне ствараць прэс-рэлізы на замежнай мове, ажыццяўляць актыўную пісьмовую камунікацыю ў іншых формах (такіх, як «fact sheet», «media advisory», «pitch letter», «newsletter» і г. д.). Студэнты таксама цікавяцца правіламі і традыцыямі арганізацыі прэс-канферэнцый у замежных краінах, стварэннем інфармацыйных бюлетэняў для друку па матэрыялах праведзенай прэс-канферэнцыі.

*Адказная за ESP для студэнтаў спецыяльнасці «Літаратурная работа» Алена Паўлаўна Смыкоўская:*

– Студэнты дадзенай спецыяльнасці праяўляюць вялікую цікавасць да прафесійна арыентаванай англійскай мовы. Для іх падрыхтаваны навучальны дапаможнік, які атрымаў грыф Міністэрства адукацыі Беларусі, што гаворыць само за сябе. Праца над удасканаленнем навучальнага працэсу і забеспячэннем студэнтаў найноўшымі арыгінальнымі распрацоўкамі працягваецца.

*Адказная за работу завочнага аддзялення Наталля Мікалаеўна Мацур:*

– На нашым аддзяленні навучаецца сапраўды таленавітая і прафесійна арыентаваная моладзь. Наша задача – дапамагчы ім авалодаць уменнямі і навыкамі агульных і прафесійна арыентываных англамоўных зносінаў. Для гэтага мы выкарыстоўваем шырокі спектр навукова-метадычнай літаратуры, аўдыё- і відэаматэрыялы, мультымедыйныя праграмы. Мы адзначаем высокі ўзровень унутранай матывацыі навучэнцаў, гатоўнасць да выкарыстання мовы ў практычнай дзейнасці.

***І. Ф. УХВАНАВА,***
***загадчык кафедры***
***англійскай мовы і маўленчай камунікацыі***

# ВЫПУСКНІКІ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ

## 1949 год

*Дневное отделение*

1. Аврамчик Николай Яковлевич
2. Антонова Нина Степановна
3. Бондарева Ефросинья Леонидовна
4. Бруй Виктория Федоровна
5. Верниковская Зинаида Павловна
6. Винник Климентий Исаакович
7. Владимиров Николай Васильевич
8. Владимирова Елена Павловна
9. Дубровская Ленина Рувимовна
10. Журавлева Любовь Михайловна
11. Кармалитова Елена Владимировна
12. Кедалова Наталья Константиновна
13. Красноперка Анна Давыдовна
14. Курто Евгений Иванович
15. Лившиц Осип Фадеевич
16. Лившиц-Петрова Антонина Федоровна
17. Лившиц Нинель Соломоновна
18. Окулов Ростислав Гаврилович
19. Плавник Александр Ефимович
20. Протько Сергей Сафронович
21. Райхман Белла Исааковна
22. Резников Яков Нахимович
23. Русалович Надежда Николаевна
24. Сапинская Евгения Петровна
25. Симоненко Елена Ивановна
26. Сницерева Нина Александровна
27. Степанова Мария Андреевна
28. Устабашидзе Леонид Александрович
29. Фадеева Лариса Яковлевна
30. Филимонов Александр Андреевич
31. Фрайман Ида Тевелевна
32. Шитик Владимир Николаевич
33. Шклярник Елена Израилевна
34. Ярошевская Галина Иосифовна

*Заочное отделение*

1. Гейдеко Алексей Игнатьевич
2. Матюшенко Григорий Дмитриевич
3. Сикорский Всеволод Михайлович

## 1950 год

*Дневное отделение*

1. Бейнер Римма Григорьевна
2. Брук Зиновий Григорьевич
3. Вайн Анна Григорьевна
